КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Траянскі конь

Спробы ўладаў наладзіць кантроль над апошнімі незалежнымі грамадзкімі і палітычнымі асяродкамі, сродкамі масавай інфармацыі працягваюцца ўвесь час, закамуфлявана альбо адкрыта, імкліва альбо паступова. Трэці сэктар ужо ня першы год змагаецца за існаваньне; стрымліваючы атакі з боку рэжыму, нясе адчувальныя страты. А ўлады, "зачышчаючы" прастору ад "нядобранадзейных" НДА, не зьбіраюцца пакідаць пасьля іх вакууму. Імі заплянаванае стварэньне цалкам падкантрольных грамадзкіх аб'яднаньняў, такіх, што існавалі ў савецкія часы. Сёлетняй вясной сэсія Палаты прадстаўнікоў будзе разглядаць законапраект "Аб рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадзкіх аб'яднаньнях". Гэтую ідэю ўраду падкінуў сам Аляксандар Лукашэнка. Паводле законапраекту "дзяржаўна-грамадзкія аб'яднаньні" мусяць быць прызнаныя асаблівым відам некамэрцыйных арганізацыяў, якія ствараюцца і ліквідуюцца вышэйшымі органамі дзяржаўнага кіраваньня, паведамляе Радыё Свабода. Умовы для іх стварэньня вызначыць прэзыдэнт альбо ўрад.

Назіраецца трывожная тэндэнцыя для грамадзянскай супольнасьці: многія мэханізмы, створаныя рэжымам, ужо адладжаныя і працуюць дакладна. Рэпрэсіўныя акцыі цяпер праводзяцца, можа, і ня хутка, але амаль бяз збояў. Ствараецца ўражаньне, што на нашых вачах праводзіцца спэцапэрацыя. Рэжым будуе своеасаблівага "траянскага каня" - цалкам падкантрольны сабе "трэці сэктар". У патрэбе ён будзе дэлегаваць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, фармаваць шэрагі назіральнікаў, выступаць зь ней-

працяг на ст. 2

Зьмест

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА 1

ПАДЗЕІ 2

АКТУАЛІІ

Юрысты НДА рыхтуюцца 4, 22
да новых сюрпрызаў ад улады

АСАМБЛЕЯ 5

ТЭМА

Повязь часоў 6
Сяргей Клімовіч

Да росквіту краязнаўства яшчэ далёка 7
Інтэрвію зь Віталём Скалабанам

Пошукі агульнага "даху" 8
Вінцэсь Дземянчук

Што трэба сапраўднаму краязнаўцу? 11
Апытаньне актывістаў краязнаўчага руху

Энтузіясты за працай 14
Ганна Гапановіч

Ці здольныя мы захаваць сваю спадчыну? 13
Вольга Чайчыц

Пастаўскія выдаўцы 15
Яраслаў Блінаў

Краязнаўчае аб'яднаньне могуць ліквідаваць 15
Мікола Мікалайчык

ІНФАРМАТАР 16

ГРОШЫ

"Замарожаныя" даляры 18
Андрэй Саванец

Дзяржава адхапіла кавалак прэміі акадэміка Сахарава 19
Вінцэсь Дземянчук

СУСЕДЗІ

1 %: многа ці мала? 20
Алёна Андрэева

Новае агульнапольскае выданьне
няўрадавых арганізацыяў 21

РЭГІЁНЫ 25

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

Рэгістрацыя сымболікі 27
Вольга Смалянка

ІНІЦЫЯТЫВА

Суд над сталінізмам адбудзецца ў Беларусі 32
Вінцэсь Дземянчук

ЗАЧЫСТКА 33

ПАДЗЕІ 34

BIBLIO

Ня ўсе беларусы сядзелі ў бульбе 36
Сьвятлана Залатуха

Траянскі конь

працяг са ст. 2

кімі заявамі ў падтрымку "правільнага курсу" кіраўніцтва дзяржавы альбо з асуджэньнем "двайных стандартаў" міжнароднай супольнасьці...

Але пакуль існуюць, пакуль дзейнічаюць і змагаюцца незалежныя грамадзкія аб'яднаньні, небясьпека ад стварэньня "траянскага каня" падаецца невялікай. Для многіх ня будзе сакрэтам, што пад абліччам лукашэнкаўскіх "анёлкаў" хаваюцца вядомыя істоты з капытамі і рогамі.

ТБМ атрымала папярэджаньне

Міністэрства юстыцыі вынесла афіцыйнае папярэджаньне Таварыству беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Папярэджаньне вынесенае за тое, што шэраг рэгіянальных структураў таварыства маюць юрыдычныя адрасы ў жылых памяшканьнях. Кіраўніцтва ТБМ лічыць папярэджаньне неабгрунтаваным і не справядлівым і зьбіраецца абскарджваць яго ў судзе.

Паводле Радыё Свабода

Звон свабоды

У Беларусі стварыўся Арганізацыйны камітэт "Звон Свабоды". Яго мэта - адліць з звон, узьвіжаньне якога прызначанае на Дзень Волі - 25 сакавіка.

Ініцыятарамі гэтай акцыі выступілі скульптар Алесь Шатэрнік і мастак Аляксей Марачкін.

Атакі на офісы працягваюцца

Міліцыянты і людзі ў цывільным працягваюць атакаваць офісы і прыватныя кватэры грамадзкіх актывістаў і апазыцыйных палітыкаў.

4 лютага ў Гомелі быў узяты ў аблогу мясцовы офіс грамадзянскай ініцыятывы "Партнэрства" і рэгіянальнай філіі БХК. Гэтаму папярэднічала затрыманьне міліцыянтамі дэпутата Рагачоўскага райсавету Зьміцера Шкулькова, у якога былі канфіскаваныя дзьве тысячы ўлётак "Партнэрства". Дзеля яго вызваленьня ў пастарунак прыяжджалі кіраўнікі мясцовых філіяў БХК і "Партнэрства" Алесь Яўсеенка і Сьвятаслаў Шаламаў. Пасьля іх вяртаньня ў свой офіс на вуліцы 50 год БССР увечары пачалася яго двухгадзінная аблога міліцыянтамі, якія стукалі ў дзьверы, адключылі ў памяшканьні электрычнасьць. Толькі пасьля таго, як каля будынку пачалі зьбірацца людзі, аблога была зьнятая.

На наступны дзень амапаўцы і людзі ў цывільным затрымалі грамадзкага дзеяча Сяргея Антончыка і яшчэ каля 20 чалавек (у асноўным прадстаўнікоў рэгіёнаў), якія сабраліся ў кватэры на вуліцы Куйбышава ў Менску. На Антончыка быў складзены пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага сходу, і яго справу разглядаў суд Савецкага раёну Менску. Грамадзкі дзяяч быў пакараны штрафам у тры мільёны шасьцьсот тысячаў рублёў.

"Тое, што адбылося са мной, ёсьць нэрвовая рэакцыя ўладаў – магчыма, нават на тую аранжавую рэвалюцыю, якая адбылася ўва Ўкраіне... Цяпер рэжыму за кожным чалавекам мроіцца нейкае моцнае аб'яднаньне, якое можа прывесьці да ўлады іншых людзей... Ім у кожнай сустрэчы людзей мроіцца небясьпека для сябе, для свайго рэжыму", – так пракамэнтаваў сытуацыю ў інтэрвію Радыё Свабода С. Антончык. Нагадаем, што ў 2004 г. С. Антончык ужо затрымліваўся за правядзеньне паседжаньня аргкамітэту грамадзкага руху самадапамогі "Айчына".

Б. П.

Мілінкевіч
ідзе ў прэзыдэнты

Арцём Лява

Вядомы грамадзкі дзяяч з Горадні **Аляксандар Мілінкевіч** зьбіраецца паспрабаваць свае сілы ў будучай прэзыдэнцкай гонцы.

Кандыдатура А. Мілінкевіча была падтрыманая Партыяй БНФ і Партыяй зялёных. Цяпер ён актыўна езьдзіць па рэгіёнах краіны, дзе сустракаецца зь мясцовымі актывістамі.

"Навіны БНФ" вярнуліся

Аднавілася выданьне бюлетэню "Навіны БНФ".

12 лютага, пасьля трохгадовага перапынку, выйшаў № 1 (79) гэтага партыйнага выданьня. Яно мусіць стаць штомесячнікам, будзе асьвятляць пытаньні палітыкі, эканомікі. Нагадаем, што "Навіны БНФ" пачалі выходзіць яшчэ ў канцы 80-х гг., як самвыдат.

А.Б.

Ціск на грамадзкіх актывістаў

Кіраўнік ініцыятывы "Партнэрства" Мікалай Астрэйка быў аштрафаваны на 20 базавых велічынь за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Такія ж адміністрацыйныя справы былі заведзеныя яшчэ супраць трох актывістаў "Партнэрства" з Гомеля, Рэчыцы і Рагачова.

Паводле Радыё Свабода

Зьмены ў "Радзе"

Сёлета ў студзені адбыліся зьмены ў кіраўніцтве Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў "Рада".

Старшынёй новага складу Прэзыдыюму саюзу была абрана Сьвятлана Каралёва, якая дагэтуль кіравала РМГА "Некст Стоп - Нью Лайф". На першай рабочай нарадзе кіраўніцтва "РАДЫ" было абвешчана пра яе новую стратэгію. Плянуецца, што ў бліжэйшыя два гады будзе зьведзенае да мінімуму супрацоўніцтва зь дзяржаўнымі органамі па працы з моладзьдзю. Прыярытэтным кірункам стане праца зь дзіцячымі і моладзевымі ініцыятывамі, з арганізацыямі, што былі ліквідаваныя ў апошнія два гады. "Рада" плянуе зьмяніць сваю інфармацыйную палітыку і зрабіць яе больш "агрэсіўнай". На студзеньскім агульным сходзе некалькі арганізацыяў-сяброў выйшлі з складу "Рады", цяпер у яе шэрагах засталося 15 арганізацыяў.



Чыноўнікі слухаюць

У пачатку году ў Міністэрстве юстыцыі Беларусі зьявіўся "тэлефон даверу" (у Менску нумар 206-37-30).

Супрацоўнікі Мінюсту сьцьвярджаюць, што штодня па тлумачэньні заканадаўства да іх зварочваюцца ад 10 да 15 чалавек. Каля чвэрці тэлефанаваньняў - гэта "скаргі на дзеяньні супрацоўнікаў упраўленьняў і органаў юстыцыі".

Б. П.

Масавыя выступленьні прадпрымальнікаў

У Беларусі прайшлі масавыя выступленьні прадпрымальнікаў, якія пратэставалі супраць увядзеньня падатку на даданую. вартасьць. Некалькі тысячаў чалавек выйшлі 1 сакавіка на Кастрычніцкую плошчу ў Менску (на здымку). Забастоўка працягваліся і ў наступныя дні.

Юрысты НДА рыхтуюцца

Да новых сюрпрызаў ад улады

У студзені ў Менску прайшоў круглы стол "Арганізацыя юрыдычнай дапамогі ў новых умовах дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў". Больш за 60 юрыстаў узялі ўдзел у абмеркаваньні праекту новай рэдакцыі Закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях, а таксама ў выпрацоўцы стратэгіі аказаньня прававой дапамогі суб'ектам грамадзянскай супольнасьці. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Выканаўчае бюро Асамблеі НДА, Інавацыйны фонд прававых тэхналёгіяў і беларускае прадстаўніцтва Асацыяцыі амэрыканскіх юрыстаў (ABA/CEELI).

Арцём Лява

У ходзе пасяджэньня былі абмеркаваныя праблемы, зь якімі могуць сутыкнуцца грамадзкія арганізацыі ў выпадку прыняцьця праекту новай рэдакцыі Закону "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях" у цяперашнім варыянце. Выступоўцы правялі аналіз зьместу законапраекту.

Падчас круглага стала былі заслуханыя даклады Юрыя Чавусава (юрыст Выканаўчага бюро Асамблеі) і Алены Танкачовай (Інавацыйны фонд прававых тэхналёгіяў) на тэму "Стратэгія абароны інтарэсаў грамадзкіх арганізацыяў: маніторынг парушэньняў, арганізацыя юрыдычнай дапамогі ў межах існых праграмаў". Слухачы былі азнаёмленыя з папярэднім досьведам працы Асамблеі НДА і Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў у гэтых напрамках. Былі прэзэнтаваныя выданьні *"Свобода ассоциаций: практика международной защиты"* і *"Право на объединение. Беларусь 1994–2004"*. Уладзімер Роўда (дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтру пры ЗБС "Бацькаўшчына", старшыня выканаўчага бюро Асамблеі НДА з 1997 па 2000 г.) прачытаў даклад "Практычны досьвед перарэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў у 1999 г.". Ён распавёў пра палітычны кантэкст "SOS-кампаніі" ў параўнаньні зь сёньняшнімі грамадзка-палітычнымі рэаліямі, пра тэхнічныя аспэкты юрыдычнай дапамогі грамадзкім аб'яднаньням у сувязі зь перарэгістрацыяй 1999 г. Асобна былі адзначаныя хібы і памылкі кампаніі 1999 г.

Вольга Смалянка (Інавацыйны фонд прававых тэхналёгіяў) выступіла з дакладам "Праект зьменаў у Закон "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях". Слухачам быў пададзены параўнаўчы аналіз дзейнага і заплянаванага тэкстаў закону, выказаныя ацэнкі магчымых наступстваў прыняцьця яго новай рэдакцыі для беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў. Была прэзэнтаваная табліца параўнаўчага аналізу дзьвюх рэдакцыяў закону.

Пасьля выступу В. Смалянкі завязалася дыскусія аб магчымых праблемах, зь якімі могуць сутыкнуцца арганізацыі ў выпадку прыняцьця зьменаў у Закон "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях". Пераважная большасьць удзельнікаў разглядала прапанаваную новую рэдакцыю Закону ў агульным палітычным кантэксьце стасункаў дзяржавы і структураў грамадзянскай супольнасьці. Асобна адзначалася сувязь з будучымі прэзыдэнцкімі выбарамі.

Працяг на стар. 22

Лютаўскія рашэньні Рабочай Групы

У лютым адбылося чарговае паседжаньне Рабочай Групы Асамблеі НДА Беларусі.

12-13 лютага сябрам РГ была прэзэнтаваная схема структуры Асамблеі, падрыхтаваная на аснове апрацаваных прапановаў, што былі выказаныя на сэмінары па ўдасканаленьні арганізацыйнай структуры (ён адбыўся ў лістападзе мінулага году). Былі разгледжаныя і прынятыя за аснову Палажэньні аб структурных адзінках Асамблеі. Рэдакцыйнай групе, створанай зь ліку сяброў РГ, было даручана на аснове выказаных прапановаў даапрацаваць Палажэньні і вынесьці іх на зацьверджаньне на наступнае паседжаньне РГ.

РГ прыняла рашэньне аб працягу тэрміну пераўліку арганізацыяў у складзе Асамблеі да 1 красавіка. Пасьля гэтай даты сяброўства ў Асамблеі тых арганізацыяў, якія не падалі дакумэнты альбо падалі ня ўсе неабходныя дакумэнты (паводле Парадку аб пераўліку сяброў Асамблеі), будзе прыпыненае. Сябрам РГ, якія былі вылучаныя ў яе склад ад рэгіёнаў, было даручана абтэлефанаваць і праінфармаваць аб тэрмінах пераўліку прадстаўнікоў арганізацыяў-сябраў Асамблеі зь іх вобласьці.

Аднагалосна было прынятае рашэньне аб прыпыненьні сяброўства ў Рабочай Групе Андрэя Дзьвігуна, абранага ў яе склад ад Магілёўскай вобласьці (ГА "Маладая грамада", Магілёў). Рашэньне было прынятае паводле п. 20 Рэглямэнту працы РГ: "Пры ненаведваньні сябрам РГ трох паседжаньняў запар без паважных прычынаў яго паўнамоцтвы прыпыняюцца рашэньнем РГ".

Таксама ў межах паседжаньня была зробленая інфармацыйная даведка аб мерапрыемствах у межах кампаніі "Наша салідарнасьць" і "Сыстэмы калектыўнай абароны", а таксама аб праектах, якія плянуюцца.

Аксана Вайтовіч

Алёна Андрэева

НДА прагнуць зьменаў у грамадзтве

5 сакавіка, з ініцыятывы Рабочай групы Асамблеі НДА, прайшоў круглы стол "НДА і зьмены у грамадзтве", асноўнай мэтай якога было вызначэньне бачаньня грамадзкіх арганізацыяў сваёй ролі ў працэсе дэмакратызацыі Беларусі.

На пачатку круглага стала выступіў палітоляг, рэдактар часопіса "Палітычная сфера" Андрэй Казакевіч, які акрэсьліў існуючую палітычную сытуацыю ў краіне. Кіраўнік плянава-аналітычнай групы народнай каліцыі "Пяцёрка плюс" Вацлаў Арэшка ў сваім выступе заявіў, што рэальных выбараў у 2006 годзе ня будзе, бо ўладзе яны непатрэбныя. "Таму мы вымушаныя дамагацца зьмены сытуацыі ў краіне іншымі спосабамі, але рабіць гэта магчыма толькі пры рэальнай кансалідацыі ўсіх магчымых сілаў: палітычных партыяў, палітычных арганізацыяў, грамадзкіх арганізацыяў і іншых структураў грамадзянскай супольнасьці", - адзначыў В. Арэшка.

З сярэдзіны 1990-х НДА зьяўляецца значным суб'ектам грамадзка-палітычнага жыцьця Беларусі. Ніводная палітычная кампанія не праходзіла без удзелу грамадзкіх арганізацыяў і ініцыятываў. Улады, ствараючы звышжорсткія ўмовы для існаваньня, самі вымушаюць грамадзкія арганізацыі заняцца вырашэньнем палітычных пытаньняў. "Разумеючы гэта, мы, грамадзкія арганізацыі і актывісты, мусім вызначыць, ці будзем удзельнічаць у выбарчай кампаніі 2006 году, і калі будзем, то якім будзе наш удзел", - сказаў старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч.

Падчас дыскусіі грамадзкія актывісты прыйшлі да высновы, што для перамогі дэмакратычных сілаў у Беларусі неабходна распрацаваць агульную стратэгію і прыцягнуць да працэсу выпрацоўкі асноўных суб'ектаў грамадзянскай супольнасьці: палітычныя партыі, НДА, прафсаюзы, бізнэсоўцаў.

У той жа дзень лідэры грамадзкіх арганізацыяў сустрэліся з кіраўнікамі дэмакратычных палітычных партыяў і некаторымі прэтэндэнтамі ў кандыдаты на прэзыдэнта. Абодва бакі выклалі сваё бачаньне неабходнага супрацоўніцтва падчас кампаніі 2006 году. Вынікам працяглай дыскусіі стала рашэньне аб супольнай выпрацоўцы стратэгіі дзеяньняў, скіраванай на перамогу дэмакратычных сілаў у Беларусі. І палітыкі, і грамадзкія дзеячы пагадзіліся, што стратэгія павінна паўстаць у найбліжэйшы час, каб не дапусьціць паўтору падзеяў 2001 г. Таксама было вырашана рэгулярна праводзіць нарады прадстаўнікоў НДА і палітычных структураў.

АА

Повязь часоў

Краязнаўства - гэта сур'ёзная сіла. У ім заангажаваныя сотні, а можа, і тысячы людзей, якія прысутнічаюць практычна ўва ўсіх рэгіёнах краіны. Краязнаўцы будзяць у грамадзтве, асабліва сярод моладзі, цікавасьць да гісторыі, да сваіх каранёў, садзейнічаюць росту нацыянальнай сьвядомасьці ў беларусаў. Яны - як пасярэднікі паміж мінулым продкаў і будучым нашых нашчадкаў, якім мусяць перадаць назапашаныя веды.

photo.bymedia.net

Краязнаўства, у прынцыпе, далёкае ад палітыкі. Нават нягледзячы на тое, што ў яго шэрагах хапае людзей, заангажаваных у палітычную дзейнасьць. Гэта спрыяе і захаваньню структураў ад рэпрэсіяў, і прыцягненьню да дзейнасьці вялікага кола людзей, і кантактам зь мясцовымі ўладамі. Але і тут часам спрацоўвае старое правіла: калі ты не цікавішся палітыкай, дык яна зацікавіцца табой.

Распавядаюць пра выпадак з найноўшай гісторыі Беларусі, які характарызуе патэнцыял і сілу краязнаўчага руху. Колькі гадоў назад адзін тады яшчэ ўплывовы ў краіне чалавек задумаў падацца ў прэзыдэнты. Але ён ня меў сваёй разгалінаванай рэспубліканскай структуры. Хтосьці падказаў яму выхад з гэтага няпростага становішча - стварэньне рэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі. З аднаго боку, пры наяўнасьці фінансавых рэсурсаў яе можна было даволі хутка стварыць, а з другога - у гэтай сытуацыі захоўвалася закамуфляванасьць сапраўдных мэтаў новай структуры. Ідэя, аднак, так і не была рэалізаваная: той дзяяч неўзабаве патрапіў у апалу і пазбавіўся сваёй вялікай пасады. Відаць, ягоная задума была раскансьпіраваная спэцслужбамі.

Энтузіязму краязнаўцаў можна пазайздросьціць. Здараецца, што асобныя людзі самастойна "раскопваюць" такія тэмы, над якімі ў іншых краінах працуюць цэлыя навукова-дасьледчыя ўстановы. Прыгадваю выпадак, калі літоўскі прафэсар ня мог паверыць, што адну навуковую працу, якая патрапіла яму ў рукі, напісаў "звычайны калгасьнік", краязнаўца зь Віцебшчыны...

Што рухае гэтымі людзьмі? Вядома ж, любоў да Бацькаўшчыны, да сваёй "малой Радзімы". Але краязнаўства - гэта яшчэ і стан душы. Для многіх гэта проста любімы занятак, магчымасьць дакрануцца да даўніны, адчуць повязь часоў. Некаторыя бачаць сваю місію ў ратаваньні і захаваньні бясцэнных матэрыялаў з гісторыі нашага краю, бо, пакуль дзяржава нарэшце зразумее важнасьць падобнай працы, шмат сапраўдных скарбаў безнадзейна згінуць.

Якім быць краязнаўчаму руху заўтра? На гэты конт існуюць самыя розныя меркаваньні. Хтосьці сканцэнтраваўся на дасьледчай працы, хтосьці - на выдавецкай. Пры наяўнасьці немалой колькасьці краязнаўчых грамадзкіх аб'яднаньняў, краязнаўцы ўсё ж пераважна працуюць індывідуальна. Толькі ў некаторых рэгіёнах існуюць моцныя краязнаўчыя цэнтры, якія каардынуюць дзейнасьць асобных людзей, гуртуюць іх вакол пэрыядычных выданьняў. Працы ж у краязнаўцаў вельмі многа, яны проста фізычна ня могуць ахапіць усё, што патрабуе ўвагі. А трэба сьпяшацца: час бязьлітасны да гістарычных памятак. Ды й "чорныя сьледапыты" робяць тут свой унёсак, ладзячы "экспэдыцыі" ў пошуку старых кнігаў, дакумэнтаў, фатаздымкаў, паштовак...

Толькі зрэдку чуваць галасы пра неабходнасьць пашырэньня сфэры дзейнасьці краязнаўцаў, напрыклад у бок турызму. Бо сёньня для іх найважнейшая задача - навучыцца зарабляць грошы, безь якіх нельга разгарнуць працу, вывесьці яе на прафэсійны ўзровень. Неабходна распрацоўваць турыстычныя маршруты па гістарычных мясьцінах, а гэта нашым краязнаўцам па сілах. У будучыні "вясковы турызм" можа займець вялікую папулярнасьць. Ужо цяпер пра гэта думае дзяржава, якая ня хоча выпусьціць турыстычны бізнэс з-пад свайго кантролю.

Хочацца верыць, што не за гарамі новы ўздым краязнаўчага руху. На гэтым фоне можа паўстаць рэспубліканская краязнаўчая структура альбо краязнаўцы абяруць за лепшы варыянт рэгіянальныя аб'яднаньні. Час усё расставіць на свае месцы.

Сяргей Клімовіч

Віталь Скалабан: Да росквіту краязнаўства яшчэ далёка

Але яго ўздым ужо пачаўся

Віталь Скалабан – вядомы беларускі гісторык і краязнаўца. Некалькі гадоў назад ён рабіў спробу стварэньня агульнарэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі, а яшчэ рыхтаваў да друку даведнік "Беларускія краязнаўцы", сабраў каштоўны матэрыял. Таму можна сьмела сказаць, што Скалабан ведае найбольш ня толькі пра краязнаўчы рух у Беларусі, але і пра сотні яго ўдзельнікаў.

– Сёньняшні стан краязнаўчага руху ў нашай краіне – гэта стан шырокай грамадзкай ініцыятывы, – гаворыць **Віталь Скалабан**. – Фактычна ўражаньне такое, што ўсе, хто хацеў надрукаваць свае працы, іх ужо надрукавалі. Іншая справа, які наклад і які ўзровень гэтых кніг. Нельга сказаць, што назіраецца сапраўдны росквіт, але што назіраецца ўздым краязнаўства – гэта адназначна. Прычым на прынцыпова новым узроўні. Асаблівасьць гэтага працэсу ў тым, што да краязнаўства далучаецца моладзь, далучаюцца людзі, якія маюць грошы. Напрыклад, бізнэсовец Валянцін Дубатоўка напісаў і выдаў цікавую кніжку пра род Сапегаў. Анатоль Атнагулаў выдаў фаліянт пра Лельчыцкі раён - Убарцкае Палесьсе. Існавала шмат краязнаўчых пэрыядычных выданьняў, пераважна незарэгістраваных, але апошнім часам іх колькасьць зьменшылася. Зь іншага боку, зьяўленьне "Краязнаўчай газеты" і тое, што яна ўжо пратрымалася больш за год, мае сваіх чытачоў, падпісчыкаў, – гэта сьведчыць пра тое, наколькі гэтая справа ўдзячная, запатрабаваная.

– Хто яны, краязнаўцы?

– Краязнаўствам займаюцца музэі, бібліятэкі (кожная абласная бібліятэка мае краязнаўчы аддзел, які рыхтуе даволі прыстойныя бібліяграфічныя матэрыялы, праўда, у адзінкавых асобніках), ВНУ і самае галоўнае, што ім займаюцца неарганізаваныя краязнаўцы. Што такое краязнаўства ў маім уяўленьні? Гэта вывучэньне пэўнай тэрыторыі, найперш – яе гісторыі, прычым вывучэньне як прафэсіяналамі (у іх лік уваходзяць сур'ёзныя навукоўцы, акадэмікі), так і аматарамі, пачаткоўцамі (у тым ліку школьнікамі, дзецьмі, якія спрабуюць дазнацца, што было да таго, як яны зьявіліся на зямлі). Акрамя таго, краязнаўства – гэта ня проста дасьледаваньні, вывучэньне чагосьці, але і грамадзкі рух, які можа быць арганізаваны і неарганізаваны.

– Краязнаўчы рух у Беларусі можна назваць арганізаваным?

– Пытаньне арганізацыі краязнаўцаў у агульнарэспубліканскую арганізацыю ўздымалася неаднаразова. Магчыма, краязнаўчае таварыства і будзе створана, хоць у мяне такога перакананьня няма, але перабольшваць яго значэньне я ня буду: не ўскладаю на гэтую структуру вялікай надзеі. Іншая справа – рэгіянальныя краязнаўчыя таварыствы, зарэгістраваныя і незарэгістраваныя. Праца ў іх рамках дазваляе краязнаўцам сустракацца, абмяркоўваць свае праблемы і рабіць добрыя краязнаўчыя справы.

НН

Віталь Скалабан (справа) падчас краязнаўчай паездкі

– Вы кажаце, што агульнарэспубліканская арганізацыя ня будзе адыгрываць вялікай ролі. Але раней, відаць, Вы думалі інакш, бо спрабавалі яе стварыць...

–У той час гэтая ініцыятыва была выкліканая тым, што Скарынаўскі цэнтар займаўся краязнаўствам, працягваў тое, чым займаўся Адам Іосіфавіч Мальдзіс. Калі краязнаўчае таварыства стане бюракратычнай структурай, дык яно будзе толькі замінаць. Але справа нават ня ў тых некалькіх асобах, што будуць сядзець у офісе, а ў тым, якія ў іх будуць магчымасьці, якія сродкі, хто іх будзе падтрымліваць.

– У якіх рэгіёнах Беларусі найбольш актыўна працуюць краязнаўцы?

– Вельмі актыўная Гарадзеншчына. Цікава было б прааналізаваць, чаму так сталася. Відаць, прычыны трэба шукаць у тым, што на Гарадзеншчыне даўно існуюць структуры, разьвіцьцю краязнаўства спрыяе Гарадзенскі ўнівэрсытэт, Нацыянальны гістарычны архіў. Бо, напрыклад, у тых жа Віцебску, Магілёве і Гомелі няма архіваў з дакумэнтамі дарэвалюцыйнага часу.

Пошукі агульнага “даху”

Краязнаўчы рух у Беларусі патэнцыйна моцны, але ў цяперашні час ня мае агульнага цэнтру. Па ўсёй краіне ў яго шэрагах налічваюцца сотні энтузіястаў, якія каардынуюць працу толькі ў асобных выпадках. Спробы стварэньня агульнанацыянальнага краязнаўчага таварыства рабіліся неаднаразова, але ўсе яны ў рэшце рэшт пацярпелі няўдачу. У мінулым годзе быў створаны чарговы аргкамітэт, які цяпер рыхтуе ўстаноўчы сход. Але, здаецца, і самі арганізатары яшчэ не да канца ўпэўненыя ў посьпеху гэтага праекту.

Спробы арганізацыйна аформіць краязнаўчы рух у Беларусі рабіліся яшчэ за савецкім часам, пачынаючы з канца 1980-х гг. Менавіта тады (сьнежань 1989 г.) стварылася **Беларускае краязнаўчае таварыства** (БКТ), якое ў 1991 г. было афіцыйна зарэгістраванае. БКТ лічыла сябе прадаўжальнікам традыцыяў беларускага краязнаўства 1920-х гг. Узначальваў раду таварыства вядомы беларускі краязнаўца **Генадзь Каханоўскі**. Толькі такі аўтарытэтны чалавек і мог аб’яднаць дасьледнікаў мінуўшчыны роднага краю з усёй краіны. На жаль, пры ім не знайшлося добрага арганізатара-“функцыянэра”, які б адладзіў каардынацыю працы рэгіянальных суполак, іх сувязь з цэнтрам. У выніку таварыства як агульнарэспубліканская арганізацыя паціху памерла. Праўда, яшчэ ў 1997 г. “Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі” аптымістычна паведамляла, што “на Беларусі дзейнасьць усіх краязнаўчых арганізацый каардынуе Рада Беларускага краязнаўчага таварыства”... Прайшло некалькі гадоў, і ў пачатку новага стагодзьдзя адбылася спроба яго рэанімацыі.

Пра спробы цэнтралізацыі краязнаўчага руху

ВАКОЛ КРУГЛАГА СТАЛА

Да актывізацыі краязнаўчага руху ў нашай краіне спрычынілася **Асамблея НДА Беларусі**. Зь яе ініцыятывы ў лютым 2001 г. у Менску адбыўся круглы стол, прысьвечаны праблемам краязнаўчага руху. Асамблея мела на мэце дапамагчы краязнаўчым арганізацыям: як мінімум – наладзіць міжсобку каардынацыю, а як максімум – распачаць супольную дзейнасьць на нацыянальным узроўні. Увага да краязнаўчага руху была не выпадковая, бо гістарычна-краязнаўчы кірунак дзейнасьці быў адным з найважнейшых на пачатку стварэньня трэцяга сэктару ў Беларусі. Вельмі шмат арганізацыяў – сяброў

Да росквіту краязнаўства...

пачатак на ст. 7

Фактычна ў кожным раёне Беларусі ёсьць краязнаўцы, нават існуюць моцныя краязнаўчыя “гнёзды”. Гэта датычыць і Віцебшчыны, самога Віцебску, а ня толькі заходняй часткі вобласьці. Цікава працавалі краязнаўцы і ў Магілёве, дзе калісьці існавала краязнаўчае таварыства на чале зь Ігарам Марзалюком (ня ведаю цяпер, у якім яно стане). А вось на Гомельшчыне сытуацыя крыху горшая.

– Ці можаце Вы параўнаць сытуацыю з разьвіцьцём краязнаўчага руху ў Беларусі і ў суседніх з намі краінах?

– У параўнаньні з нашымі суседзямі выглядаем мы няблага. Згадаю тую ж сэрыю кніг “Памяць”, выданьне якой заканчваецца. Кнігі рыхтаваліся ў т. зв. пераходны пэрыяд, таму хібаў хапае. Але добра ўжо тое, што побач з матэрыяламі пра Вялікую Айчынную вайну знайшлі месца і гісторыка-краязнаўчыя артыкулы. Проста выдатна, што кожны раён мае сваю кніжку. Вядома, аналягі такіх выданьняў ёсьць і за мяжой. У той жа Эўропе кажуць, што ведаюць гісторыю кожнай вёсачкі.

Праблемы ў краязнаўчым руху аднолькавыя ў розных краінах. Наколькі я ведаю, у Саюзу краязнаўцаў Расеі паўсталі арганізацыйныя праблемы, былі складанасьці зь перарэгістрацыяй.

– А які лёс краязнаўчай энцыкляпэдыі?

– Ідуць размовы. “Краязнаўчая газета” рэгулярна друкуе артыкульчыкі пад рубрыкай “Краязнаўчая энцыкляпэдыя”. А я зьбіраў матэрыялы для даведніка “Беларускія краязнаўцы”. Ён быў укладзены, але так і ня ўбачыў сьвету. Пасьля дапрацоўкі яго можна было б выдаць. Ён ляжыць, а каштоўнасьць сабранага матэрыялу вялікая.

– І колькі краязнаўцаў адгукнулася на Вашую прапанову?

– Дзесьці каля 400 чалавек. Яны даслалі свае анкеты і фатаздымкі.

– А якой лічбай Вы ацанілі б колькасьць краязнаўцаў у Беларусі?

– У кожным з 117 раёнаў Беларусі ёсьць краязнаўцы, у адных іх менш, у другіх больш. Думаю, што сёньня іх налічваецца ад адной да некалькіх тысячаў чалавек. У адным толькі Менску сколькі краязнаўцаў!

Размаўляў Сяргей Клімовіч

Асамблеі працягвалі пазначаць краязнаўчую дзейнасьць як адзін з кірункаў сваёй працы (але гэта не азначала, што ўсе яны ёю займаліся). Прычым спэктар краязнаўчых арганізацыяў быў даволі шырокі: ад вялікіх аўтарытэтных арганізацыяў і асобаў да невялікіх школьных гурткоў і асобных актывістаў. Гэтыя арганізацыі традыцыйна мелі добрыя сувязі з насельніцтвам, працавалі з больш шырокімі коламі людзей, чым многія іншыя НДА, да таго ж у іх быў пазытыўны імідж.

Зь іншага боку, у канцы 1990-х гг. краязнаўчы рух у нашай краіне перажываў няпросты час. "Пік інтарэсу да сваіх каранёў, характэрны для пачатку і сярэдзіны 1990-х, да таго часу ўжо саслабеў, -распавядае тагачасная супрацоўніца Выканаўчага бюро **Ірына Віданава.** - Зьмянілася стаўленьне цэнтральных і мясцовых уладаў - зь сяброўскага да нэўтральнага і нават варожага. Зьменшыўся інтарэс да краязнаўчых праектаў з боку замежных донараў, якія больш ня бачылі, як падобнага роду дзейнасьць можа спрыяць дэмакратычным зьменам у Беларусі".

І ўсё ж цікаўнасьць да круглага стала была вялікая. З дапамогай вядомага беларускага краязнаўцы і навукоўца **Віталя Скалабана** Выканаўчае бюро Асамблеі запрасіла ў Менск найбольш актыўных удзельнікаў краязнаўчага руху. Адгукнуліся і прыехалі дзясяткі людзей з усіх рэгіёнаў Беларусі. У круглым стале на тэму **"Краязнаўчы рух на Беларусі: гісторыя разьвіцьця, праблемы і пэрспэктывы"** ўдзельнічалі таксама экспэрты, журналісты і нават адзін чыноўнік зь Міністэрства спорту і турызму, які быў у якасьці госьця. Даволі цікавая дыскусія чаргавалася з прэзэнтацыяй рэгіянальных праектаў ці нават асобных арганізацыяў. Размова ішла пра існы стан супрацоўніцтва паміж краязнаўцамі. Асноўнай праблемай было названа недастатковае фінансаваньне.

Здавалася, што мерапрыемства атрымалася надзвычай пасьпяховым. У арганізатараў склалася ўражаньне, што ўсе прысутныя зразумелі: будучыня, як і магчымасьць прыцягнуць сродкі ў беларускі краязнаўчы рух, за супольным, агульнанацыянальным праектам. Менавіта ён мог бы кансалідаваць працу розных групаў, дазволіў бы стварыць сетку для абмену інфармацыяй і досьведам, дапамог бы прапагандаваць беларускую гісторыю, мову, культуру.

ПРЫЧЫНЫ НЯЎДАЧЫ

Чаму ж з гэтай ініцыятывы нічога не атрымалася? На думку Ірыны Віданавай, у той час не знайшлося лідэра і арганізатара, "які б сапраўды ўзяў на сябе ролю каардынатара і "рухавіка" гэтай ідэі". Хаця фармальна каардынатарам будучага супольнага праекту ўдзельнікамі круглага стала быў абраны **Ігар Марзалюк** з Магілёва.

Па вэрсіі арганізатараў, памылковай была пазыцыя краязнаўцаў: спачатку здабудзем сродкі, а ўжо пасьля пачнем працаваць, рэалізоўваць ідэі. Прычым чакалася, што пошукам фінансаваньня зоймецца хтосьці іншы, а самі не зрабілі ў гэтым напрамку значных крокаў.

Арганізатары круглага стала настройвалі ўдзельнікаў на іншы варыянт: краязнаўцы рыхтуюць праект і распрацоўваюць плян дзейнасьці, а Выканаўчае Бюро пры падтрымцы Рабочай Групы Асамблеі дапаможа ў пошуку і атрыманьні фінансаваньня. А тут яшчэ ўзьніклі дыскусіі, на што ў першую чаргу патрэбныя сродкі. На жаль, пераважала тая частка актывістаў, якая найбольш клапацілася пра тэхнічнае забесьпячэньне праекту (офісы, тэхніка, штат), а не пра сутнасьць нацыянальнай краязнаўчай кампаніі. Пры абмеркаваньні дэталяў стала відавочна, што ўва ўдзельнікаў рознае бачаньне самога праекту.

Ігар Марзалюк лічыць, што ў няўдачы ініцыятывы вінаватыя арганізатары круглага стала, якія распачалі справу, але не давялі яе да канца. "Што ад нас (краязнаўцаў) залежала, мы зрабілі", - кажа Марзалюк. Але фінансаваньне не было знойдзенае, і ідэя заглохла. Сёньня пра заснаваную тады **"Асацыяцыю краязнаўчых арганізацыяў"** мала хто памятае...

"АДПАВЕДНЫЯ ФОНДЫ" НЕ ДАПАМАГЛІ

Краязнаўцы Гарадзеншчыны прымалі актыўны ўдзел у круглым стале, які ладзіла Асамблея, выступалі з дакладамі. На той час яны ўжо мелі **Беларускае краязнаўчае таварыства імя Тодара Нарбута,** заснаванае ў чэрвені 1998 г. Ачольваў яго прафэсар Гарадзенскага ўнівэрсытэту **Сяргей Габрусевіч.** Была створаная Гарадзенская абласная краязнаўчая асацыяцыя на чале з прафэсарам **Андрэем Майсяёнкам**, утвараліся арганізацыі ў раённых цэнтрах вобласьці. Фактычна БКТ імя Т. Нарбута прэтэндавала на ролю агульнанацыянальнай арганізацыі. З 2000 г. яно выдавала штомесячны бюлетэнь "Краязнаўчая газета". На БКТ ускладалі вялікія надзеі і краязнаўцы зь іншых рэгіёнаў краіны. Заставалася толькі зарэгістраваць БКТ, але вось з гэтым узьніклі праблемы.

Прафэсар А. Майсяёнак пісаў у лютым 2001-га: "Цяжкасьці з рэгістрацыяй БКТ імя Т. Нарбута зможам пераадолець, калі сумесна зробім праекты на фінансаваньне з адпаведных фондаў, мабілізуем унутраныя рэзэрвы". Спадзяваньне на падтрымку краязнаўчых праектаў ня спраўдзілася, безь фінансаў спынілася і арганізаваная, скаардынаваная праца. Зразумела, краязнаўцы працягваюць займацца сваёй улюблёнай справай, але паасобку. На цяперашні час БКТ імя Т. Нарбута ўжо не працуе, замерла дзейнасьць і большасьці яго раённых філіяў.

РЭАНІМАЦЫЯ №2

У лістападзе 2001 г. быў створаны аргкамітэт па аднаўленьні **Беларускага краязнаўчага таварыства** (БКТ). Цэнтрам яго быў **Нацыянальны навукова-асьветны цэнтар імя Францішка Скарыны.** Намесьнікам дырэктара гэтай установы ў той час працаваў Віталь Скалабан.

Рашэньне пра стварэньне аргкамітэту прынялі ўдзельнікі навукова-практычнага сэмінару "Беларускае краязнаўства: стан і пэрспэктывы", які прайшоў у Скарынаўскім цэнтры. Краязнаўчы зьезд быў заплянаваны на вясну 2002 г. "Сёньня адчуваецца неаб-

ходнасьць рэанімацыі таварыства, якое павінна сканцэнтравацца на праблемах гісторыі краязнаўства, падрыхтоўцы вучэбных праграмаў, дапаможнікаў і выданьняў", - гаварыў у той час В. Скалабан.

Падтрымка краязнаўчай ініцыятывы Скарынаўскім цэнтрам была важнай. Але зь іншага боку, пасьля таго як В. Скалабан сышоў з сваёй пасады ў цэнтры, заглохла і ініцыятыва.

ЧЫЯ ІНІЦЫЯТЫВА?

Напрыканцы мінулага году стала вядома, што робяцца чарговыя захады па стварэньні рэспубліканскага краязнаўчага таварыства. Высьветлілася, што, сапраўды, існуе **аргкамітэт на чале з Анатолем Бутэвічам**, які праводзіць падрыхтоўчую працу.

ДАВЕДКА "АСАМБЛЕІ":
Анатоль Бутэвіч (1948 г. н.) - беларускі дзяржаўны дзяяч, пісьменьнік, перакладчык, публіцыст, крытык. У канцы 1980-х працаваў намесьнікам загадчыка ідэалягічнага аддзелу ЦК КПБ. З 1990 г. - старшыня Дзяржаўнага камітэту БССР па друку, пасьля - міністар інфармацыі. У 1996–2000 гг. на дыпляматычнай службе. Цяпер працуе ў банкаўскай сфэры.

Мяркуецца, што 29 сакавіка ў Менску павінен адбыцца ўстаноўчы сход краязнаўчага таварыства. Але ці адбудзецца - яснасьці яшчэ няма (прынамсі, на той час, як пішуцца гэтыя радкі, у рэгіёнах толькі некаторыя краязнаўцы чулі пра гэтую ініцыятыву). Сам кіраўнік аргкамітэту А. Бутэвіч, пасьля доўгіх развагаў, вырашыў адмовіцца ад інтэрвію "Асамблеі". Таму ягоныя дачыненьні да трэцяга сэктару і краязнаўства для нас застаюцца таямніцай (праўда, вядома, што ён нядаўна выдаў кніжку пра Мірскі замак).

Да аргкамітэту мае дачыненьне старшыня выканкаму ГА "Беларускі фонд культуры" **Уладзімер Гілеп.** З 2003 г. гэтае грамадзкае аб'яднаньне выдае штотыднёвую "Краязнаўчую газету" (у лік заснавальнікаў таксама ўваходзіць вытворчае прыватнае прадпрыемства "Светач", дзе, дарэчы, газэта і друкуецца). Гілеп зьяўляецца галоўным рэдактарам, а Бутэвіч уваходзіць у склад рэдкалегіі. "Краязнаўчая газета" - выданьне неадназначнае: на яе старонках пабачыш як артыкул А. Грыцкевіча пра Слуцкае антыбальшавіцкае паўстаньне 1920 г., так і матэрыял былога кіраўніка прэс-службы

photo.bymedia.net

КДБ Беларусі Г. Сенюкова пра галоўнага чэкіста БССР 1920-х гг. Апанскага...

"Няхай працуюць, - кажа адзін з актывістаў краязнаўчага руху з правінцыі. - Незразумела толькі, чаго яны хочуць. Калі "пад сябе" стварыць арганізацыю - адна справа, а калі для патрэбаў краязнаўцаў - зусім іншая. Апошні варыянт я падтрымліваю".

Але нядобразычліўцы перакананыя, што за гэтай ініцыятывай можа стаяць улада. Што нібыта яна пажадала ўзяць пад свой кантроль краязнаўчы рух. Адзін зь яго актывістаў так пракамэнтаваў магчымы ўдзел улады ў ініцыятыве Анатоля Бутэвіча: "Мы даўно разумеем, што як толькі яны залазяць у краязнаўства, справіцца зь ім ня могуць. Яны і ідэалёгію ў яго ня ўсунуць. Мы ж капаем факты, а з фактамі нічога ня зробіш!"

Шэраг грамадзкіх актывістаў ня бачаць нічога кепскага ў супрацоўніцтве краязнаўцаў з органамі ўлады. "Абы давалі грошы на краязнаўчы рух", - кажа адзін зь іх. Другі адзначае, што "спалучэньне дзяржаўнага і грамадзкага дазваляе пасьпяхова рэалізоўваць некаторыя краязнаўчыя праекты". Трэці суразмоўца пераконвае, што краязнаўчы рух у Беларусі хоць і не цэнтралізаваны, але ўжо настолькі моцны, што ўсе спробы ўладаў кантраляваць яго, а тым больш накіроўваць і "перавыхоўваць", асуджаныя на няўдачу.

І сапраўды, гвалт над акадэмічнай гісторыяй, які ўчынілі "ідэолягі" рэжыму, паўтарыць у краязнаўстве немагчыма. Сотні энтузіястаў па ўсёй краіне працуюць аўтаномна, маюць добрыя стасункі зь мясцовымі жыхарамі, зь бібліятэкамі, навучальнымі ўстановамі, выдаюць свае краязнаўчыя бюлетэні, часопісы, кніжкі. Загнаць гэтых людзей пад адзін "дах" уладам ня ўдасца, але стварыць перашкоды ў дзейнасьці могуць, некаторым ужо ствараюць.

Ідэя заснаваньня агульнанацыянальнай каардынацыйнай структуры краязнаўчага руху была і застаецца актуальнай. Ініцыятыва можа зыходзіць як з сталіцы, так і з рэгіёнаў (напрыклад, нядаўна паўстала ініцыятыва "Асацыяцыя краязнаўцаў малых мястэчак Магілёўшчыны"). Апошнія яшчэ не сказалі свайго слова, яшчэ не рэалізавалі свайго патэнцыялу, бо працуюць пераважна ў неспрыяльных для сябе варунках, ня маюць дастатковага матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня. Але, нягледзячы ні на што, робяць патрэбную і важную справу - па драбочках зьбіраюць зьвесткі, аднаўляюць невядомыя старонкі нашай гісторыі, захоўваюць сапраўдныя скарбы для нашчадкаў, для Беларусі.

Вінцэсь Дземянчук

АМУНІКАТ

Што трэба сапраўднаму краязнаўцу?

Мы прапанавалі краязнаўцам з розных рэгіёнаў краіны адказаць на два пытаньні:
1. Зь якімі праблемамі Вам найчасьцей даводзіцца сутыкацца ў сваёй дзейнасьці?
2. Ці лічыце Вы неабходным існаваньне рэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі? Калі так, то якія мусяць быць яе функцыі?

Мікалай Аніскавец, Лоеў:

1. Улады не даюць магчымасьці рэальна працаваць. Мы адчуваем, наколькі хваравіта яны рэагуюць на нашую дзейнасьць. Вядома ж, вялікая праблема - адсутнасьць належнай фінансавай базы.

2. Думаю, што патрэбная. Яна мусіць узяць на сябе каардынацыйныя функцыі.

Васіль Дубейка, Баранавіцкі раён:

1. Найперш матэрыяльныя перашкоды, бо я стараюся шмат працаваць у архівах, а гэтыя паездкі патрабуюць нямала грошай. Ды й трэба, каб з працы адпусьцілі (ехаць жа трэба не на адзін дзень), а я працую дырэктарам школы. У нас якраз памянялася кіраўніцтва ў раёне. Ранейшае спрыяла ў маёй дасьледчай працы, а цяперашняе не зусім разумее, навошта мне маё захапленьне краязнаўствам... Я ўжо не гавару пра выданьне кніг, якіх у мяне падрыхтавана да друку дзясятак! Пакуль няма магчымасьці іх выдаць.

2. Безумоўна, патрэбная. Краязнаўцам практычна немагчыма працаваць з архіўнымі крыніцамі, бо існуе праблема нераспрацаванасьці "даведачнага апарату" архіваў. Праз гэта краязнаўцу цяжка зразумець, дзе шукаць патрэбныя матэрыялы. Даводзіцца рабіць шмат лішняй работы. Нейкія цэнтральныя каардынацыйныя органы маглі б тут нечым дапамагчы. Галоўнае, каб людзі ў гэтай рэспубліканскай арганізацыі працавалі, а не сядзелі.

Аляксей Дуброўскі, Пінск:

1. Праблема ў забесьпячэньні краязнаўчай дзейнасьці неабходнымі фінансавымі сродкамі. Я, хоць і пэнсіянэр, падчас збору матэрыялаў праяжджаю на ровары сотні кілямэтраў. Мне гэта ўжо цяжкавата... А трэба сьпяшацца, каб зафіксаваць на фатаздымках, відэаплёнцы тыя помнікі, мясьціны, якія нашыя нашчадкі могуць ужо не пабачыць. Трэба запісаць успаміны людзей, якія часта зь вялікай ахвотай распавядаюць найцікавейшыя рэчы! На аснове сваіх экспэдыцыяў рыхтую фотавыставу, здымаю відэафільмы. А яшчэ ёсьць праблема ў адносінах зь мясцовымі ўладамі. Неяк прапанаваў ім стварыць пад эгідай гарвыканкаму эколяга-краязнаўчы клюб, дык яны так і не далі адказу...

2. Рэспубліканская арганізацыя патрэбная. Сярод яе функцыяў вылучу асьветніцкую працу сярод моладзі (мала прапагандуецца краязнаўчы матэрыял!) і працу дасьледчую: у архівах, экспэдыцыях, у размовах зь людзьмі.

Міхась Карпечанка, Бялынічы:

1. Праблема ў пасіўнасьці - і краязнаўцаў, і насельніцтва. А яшчэ - у амбіцыях краязнаўцаў, якіх цяжка аб'яднаць у адну структуру. У нас, праўда, зьявілася ініцыятыва "Асацыяцыя краязнаўцаў малых мястэчак Магілёўшчыны", да якой далучыліся найбольш актыўныя, тыя, што хацелі аб'яднацца. Спадзяемся, што яна дапаможа на больш высокім узроўні, супольна вырашаць праблемы па ахове помнікаў даўніны і г. д., а таксама і праблемы нашага аб'яднаньня.

2. Яго ўтварэньне аблегчыла б нашу сытуацыю. Калі будуць існаваць яго раённыя філіі, дык вырашыцца праблема з рэгістрацыяй - трэба будзе толькі стаць на ўлік у райвыканкаме. Тады ня будзе праблемы і з дакумэнтамі, бо сёньня за зьмены ў статуце аб'яднаньня мусім плаціць вялікія грошы... Важна, каб рэспубліканскае краязнаўчае аб'яднаньне зьвярнула ўвагу на мясцовыя аб'яднаньні, каб дапамагло ім стаць сталымі арганізацыямі.

Ада Райчонак, Шаркаўшчынскі р-н:

1. Праблема ў непаразуменьнях з уладамі. Для правядзеньня сустрэчаў з моладзьдзю ўлады не даюць памяшканьняў. З выданьнем праблемаў няма: выходзіць нашая краязнаўчая газэта "Бацькаўшчына", праўда, цяпер маем часовую затрымку.

2. Вядома, патрэбная. Наш цэнтар і стварыўся з мэтай аб'яднаньня мясцовых краязнаўчых сілаў. Стварыў яго мой сын Міхась, якога ўжо няма сярод нас... Рэспубліканская арганізацыя мусіць аб'ядноўваць усе краязнаўчыя сілы, усіх сапраўдных краязнаўцаў.

Юры Качук, Зэльва:

1. У краязнаўчай працы найважнейшыя праблемы - фінансавыя і матэрыяльна-тэхнічныя. Няма ксэракса, кампутар стары, і на ім ужо немагчыма працаваць... Але нешта спрабуем рабіць. Маем ініцыятыву "Гміна", у рэгістрацыі якой нам двойчы адмовілі. Мясцовыя ўлады не замінаюць. Наадварот, зацікавіліся зьместам часопісу "Бэз", які я выдаю. Там, дарэчы, друкуецца шмат краязнаўчых матэрыялаў.

2. Абавязкова патрэбна. Зарэгістраваная рэспубліканская структура магла б дапамагаць краязнаўцам з рэгіёнаў расшукваць патрэбныя архіўныя матэрыялы, знаходзіць партнэрскія арганізацыі за мяжой. Ды й працы па пошуку і зборы інфармацыі багата, і трэба сьпяшацца, бо адыходзяць старажылы.

Ігар Марзалюк, Магілёў:

1. Праблема адна і тая ж - татальны недахоп грошай. Усе ас-

Удзельнікі навукова-краязнаўчай канфэрэнцыі "Браслаўскія чытаньні" каля помніка Станіславу Нарбуту. Браслаў, 2003 г.

татнія праблемы на сёньняшні дзень - вырашальныя. Ёсьць магчымасьць дагрукацца і да высокіх кабінэтаў, калі справа ідзе пра краязнаўчую дзейнасьць, а не якую іншую. А фундатары лічаць, што краязнаўчыя праекты, у адрозьненьне ад іншых, не зьяўляюцца актуальнымі. На жаль, яны і прадстаўнікі краязнаўчага руху гавораць на розных мовах. А цяпер вельмі важна, каб публікацыі краязнаўцаў даходзілі да якмага шырэйшага кола людзей, найперш школьнікаў і студэнтаў.

2. Ініцыятыва стварэньня рэспубліканскай краязнаўчай арганізацыі вартая падтрымкі. Яе існаваньне можа спрасьціць вырашэньне многіх праблемаў, зь якімі сутыкаюцца краязнаўцы.

Станіслаў Суднік, Ліда:

1. Я б не сказаў, што на сёньняшні дзень у нас ёсьць вялікія праблемы. У Лідзе няма ніякіх перашкодаў для краязнаўчай дзейнасьці і быць ня можа! У нас існуюць 6 краязнаўчых арганізацыяў: таварыства імя Тодара Нарбута, "Павет", астатнія чатыры вядуць краязнаўчую працу паралельна з асноўнай дзейнасьцю. Праблема адна - мы недастаткова адукаваныя, каб адшукаць у замежных публікацыях, у тым жа Інтэрнэце матэрыялы на тэмы, што нас цікавяць. А ў выдавецкай дзейнасьці праблема адна – грошы.

2. Вядома, патрэбная. Таксама як і абласная, раённыя арганізацыі. Скрайне неабходныя! Найперш у яе мусяць быць каардынацыйныя функцыі. Напрыклад, мы, лідзкія краязнаўцы, маем інфармацыю пра гісторыю іншых рэгіёнаў, Слоніму ці Ашмянаў, якая нас не цікавіць. І куды нам яе падзець? Рэспубліканская арганізацыя якраз дапамагала б у гэтай праблеме. Альбо наадварот, каб нам перасылалі інфармацыю пра гісторыю Лідчыны зь іншых рэгіёнаў. Таму рэспубліканская арганізацыя павінна дапамагчы ў справе абмену інфармацыяй.

Уладзімер Хільмановіч, Горадня:

1. Асноўная праблема - нешта аддрукаваць і выдаць. На сёньняшні дзень ужо многія краязнаўцы нават і кампутары маюць, набіраюць свае публікацыі. Але ім няма дзе друкавацца. Праблема з паліграфічным абсталяваньнем.

2. Не зашкодзяць краязнаўчыя арганізацыі ў рэгіёнах, прычым не на абласным, а на раённым узроўні. Наогул, чым ніжэйшы ўзровень, тым больш патрэбная такая каардынацыя працы. Што да рэспубліканскай арганізацыі, дык тут усё залежыць ад таго, чым яна можа дапамагчы краязнаўцам. Патрэбная каардынацыя. Было б выдатна, каб яна заснавала выданьне кніжных сэрыяў.

Кастусь Шыдлоўскі, Браслаў:

1. Адна з асноўных праблемаў - гэта фінансаваньне. Безь яе вырашэньня некаторыя праекты цяжка рэалізаваць. Бо часта неабходна правесьці працу ў архівах, а гэта патрабуе сродкаў. Другая праблема - у апошнія гады назіраецца пэўная пасіўнасьць людзей, якія раней актыўна працавалі ў нашым таварыстве. З 15 сяброў таварыства цяпер актыўна працуюць 4-5. Можа, на гэта ўплывае сама сытуацыя ў грамадзтве?

2. Такая арганізацыя патрэбная як паветра. Калі б існавала нацыянальная краязнаўчая арганізацыя, а мы ўвайшлі ў яе на правах асацыяванага сябра, для нас быў бы добры "дах".

Краязнаўцы адзіныя ў тым, што галоўнай праблемай для іх зьяўляецца амаль поўная адсутнасьць фінансаваньня. Але краязнаўцы ў такой сытуацыі і ня думаюць спыняць сваю дзейнасьць, знаходзяць магчымасьці, укладаюць уласныя сродкі. Такім чынам, краязнаўчая праца не замірае, але і не набывае таго разьвіцьця, на якое можна было б спадзявацца пры большменш стабільным фінансаваньні краязнаўчых праектаў. Слабая ўвага фундатараў да краязнаўства прыводзіць да сытуацыі, калі краязнаўцы ў некаторых выпадках шукаюць падтрымку ў рэалізацыі праектаў у мясцовых уладаў і часам яе там знаходзяць. Іншая значная праблема - пасіўнасьць краязнаўцаў, у тым ліку і ў пошуку фінансаваньня. Адносіны зь мясцовымі ўладамі ў краязнаўцаў розных рэгіёнаў складваюцца па-рознаму: у адных гарадах і мястэчках чыноўнікі перашкаджаюць актывістам у іх дзейнасьці, у другіх - наадварот, спрыяюць.

Усе краязнаўцы лічаць неабходным стварэньне рэспубліканскай краязнаўчай структуры, якая, у іх бачаньні, павінна стаць найперш каардынацыйным цэнтрам. А яшчэ яна неабходна краязнаўцам з рэгіёнаў, як своеасаблівы "дах", пад якім можна было б спакойна і плённа працаваць, на абсалютна афіцыйных падставах.

Падрыхтаваў Алег Качан

Ці здольныя мы захаваць сваю спадчыну?

Мая краіна – гэта прыгожа раскінутыя лясы і палеткі, азёры і рэкі, уздоўж якіх прытуліліся беларускія вёсачкі і паселішчы. Сялянскія хаткі ў суседзтве з храмамі і званіцамі, шматлікімі палацамі і сядзібамі, вялікай колькасьцю замкаў перадаюць нацыянальны калярыт, ствараюць атмасфэру, настоеную на старажытнасьці, на самабытнай гісторыі і культуры нашай зямлі. Але ж ці ўласьціва ўсё, аб чым ідзе гаворка, сучаснай Беларусі? Ці здолелі мы захаваць створаныя продкамі помнікі велічнасьці нашага краю? І наогул, ці любім мы сваю краіну?

Аднойчы 8-гадовы хлопчык сказаў: "Вы гаворыце, што любіце кветкі, але зрываеце іх, вы гаворыце, што любіце жывёлаў, але забіваеце іх, вы гаворыце, што любіце зямлю, але зьнішчаеце яе. Я баюся таго дня, калі вы скажаце, што любіце мяне". Дык такую любоў праяўляем мы да нашай гісторыі? Чаму шматлікія помнікі Беларусі сёньня застаюцца ў руінах? Чаму ў такім катастрафічным стане знаходзяцца Ружанскі "Вэрсаль", Косаўскі палац, замкі ў Гальшанах і Гаранёнах, кляштар у Бярозе, Бабруйская крэпасьць, шматлікія касьцёлы і сядзібы Беларусі? Разьбіраецца наша сьвядомасьць і спадчына па каменьчыках... на памяць турыстамі-вандаламі...

Час бяжыць. У Беларусі будуюцца лядовыя палацы, бібліятэка... А калі ж дойдзе чарга да нашай гістарычнай спадчыны? Бо зусім магчыма, што праз некалькі гадоў давядзецца сузіраць усё тое, што яшчэ сёньня маем, толькі на фатаздымках і малюнках. Як, прынамсі, атрымалася з адлюстраванымі Напалеонам Ордам помнікамі архітэктуры: ужо большая іх частка існуе толькі на драўляных планшэтках ды яшчэ ў памяці некаторых з нас. Дзяржава відавочна не зацікаўленая ў захаваньні нашай культуры, традыцыяў, мовы, помнікаў даўніны. Ёй не патрэбная нацыянальная самасьвядомасьць грамадзянаў краіны, якая замінае ў справе кіраваньня імі. Скептыкі кажуць, што без удзелу дзяржавы, на адным толькі энтузіязьме нічога ня зробіш.

photo.bymedia.net

Але ж не! Аказваецца, можна! І вось вам прыклад. Моладзь, якая цікавіцца і ганарыцца культурай Беларусі, яе гістарычнай спадчынай, 15 красавіка 2003 г. стварыла **гісторыка-краязнаўчае таварыства "Этна".** Яго ўдзельнікі праводзяць сэмінары, канфэрэнцыі, арганізоўваюць вандроўкі з мэтай вывучэньня роднага краю, займаюцца папулярызацыяй мовы і традыцыяў, спрабуюць адрадзіць культуру Беларусі. Летам 2004 г. таварыства распачало працу дзеля выратаваньня ад разбурэньня Крэўскага замку, помніка архітэктуры XIV ст.

З даўніх часоў бярэ пачатак выслоўе: "Каб ты на Крэўскі замак камяні цягаў". Словы гэтага праклёну ўвекавечылі неймаверныя высілкі, укладзеныя продкамі ў магутныя сьцены, якія сталіся непераадольнымі для шматлікіх заваёўнікаў нашай зямлі. Непасрэдна ў Крэўскіх мурах, як вядома, адбываліся важныя падзеі ў гісторыі нашай краіны, часта трагічныя. А ў часе Першай сусьветнай вайны ў ходзе жорсткіх баеў у Крэўскіх ваколіцах муры гістарычнага помніка былі разбураныя артылерыяй расейскай арміі. Пасьля гэтага ўжо многія дзесяцігодзьдзі руіны выглядаюць як самотная пустэльніца. Але цяпер зьявілася пагроза зьнішчэньня нават таго, што засталося. Вось чаму ўдзельнікі таварыства распачалі сваю працу. І за гэты час шмат што пасьпелі зрабіць.

Атрымаўшы дазвол ад Міністэрства культуры, распачалі кансэрвацыю замку. Яшчэ ўлетку хлопцы цягалі камяні на муры, латаючы найбольш небясьпечныя месцы, якія пагражалі разбурэньнем. У гэты ж час пачаўся працэс стварэньня этнаграфічнага музэю ў вёсцы Крэва. Пакуль хлопцы працавалі на мурах, дзяўчаты зьбіралі будучыя экспанаты ў музэй, а таксама народныя песьні, паданьні і легенды Крэва, тапанімічныя назвы і зьвязаныя зь імі гісторыі. Жыла моладзь непадалёку ад замку ў намётах. Увечары, стомленыя, але шчасьлівыя ад зробленай за дзень працы, распавядалі адно аднаму легенды, якія пачулі ад мясцовых жыхароў.

За працай незаўважна скончылася лета, прыйшоў час халадэчы. Але гэта не палохае ўдзельнікаў таварыства. Кожныя выходныя яны выбіраюцца ў Крэва, каб працягваць распачатае. Працы шмат. Вось чаму будзе карысная любая дапамога. Таму ўсіх, хто ўсьведамляе значнасьць гэтай справы, кім кіруе любоў да Радзімы, таварыства "Этна" запрашае да супрацоўніцтва. І ўжо разам мы будзем сьмела глядзець у будучыню, спадзявацца, што цудоўныя краявіды з шэдэўрамі мясцовай архітэктуры яшчэ доўгі час будуць уражваць наведвальніка сваёй непаўторнасьцю.

Вольга Чайчыц

Энтузіясты за працай

Чым сёньня займаюцца краязнаўцы ў розных рэгіёнах краіны?

Краязнаўцы маюць шмат працы ў любы час: і зімою, і ўлетку. Хтосьці ў цёплую пару году назапашвае матэрыял у экспэдыцыях, каб у халодныя месяцы яго апрацоўваць. Некаторыя сабралі ўжо такія багатыя калекцыі дакумэнтаў, успамінаў, фатаздымкаў, што шмат гадоў могуць аўтаномна працаваць, пісаць кнігі, дасьледаваньні. Але дзе ж ты ўседзіш дома, калі памятаеш, што яшчэ не пасьпеў запісаць цікавы ўспамін старажыла, пра якога акрамя цябе ніхто ня ведае...

Вельмі актыўныя краязнаўцы Лідчыны, якія маюць сваё зарэгістраванае выданьне - часопіс **"Лідзкі летапісец".** Ужо выйшлі 26 нумароў гэтага выданьня. Часопіс зьмяшчае матэрыялы, якія асьвятляюць раней невядомыя старонкі лідзкай гісторыі. У апошніх нумарах друкаваліся сьпісы сотняў тамтэйшых удзельнікаў нацыянальна-вызвольных паўстаньняў 1794 і 1863 г. Друкаваўся радавод роду Каліноўскіх, грунтоўны матэрыял пра лідзкую антысавецкую арганізацыю, якая існавала ў 1950-х гг. Цяпер рыхтуецца наступны нумар "Лідзкага летапісца".

Язэп Палубятка з Мастоў кажа, што мясцовыя краязнаўцы працуюць над кнігай, у якой мяркуюць распавесьці пра гісторыю ўсіх населеных пунктаў раёну. З кнігі "Памяць" Мастоўскага раёну рэдактарамі была павыкрэсьленая палова сабранага краязнаўцамі матэрыялу. Таму і ўзьнікла патрэба выданьня непадцэнзурнай кнігі.

Вельмі моцныя краязнаўчыя кадры сканцэнтраваныя ў Горадні. Там краязнаўчы рух калісьці быў вельмі актыўным, было наладжанае добрае супрацоўніцтва зь бібліятэкамі і навучальнымі ўстановамі, выходзіла "Краязнаўчая газета". Цяпер краязнаўцы працуюць больш індывідуальна.

Уладзімер Хільмановіч, адзін з заснавальнікаў БКТ імя Т. Нарбута, ужо некалькі гадоў працуе над краязнаўчым даведнікам Гарадзеншчыны. На старонках даведніка ён хацеў бы адлюстраваць, чым адметны той ці іншы населены пункт вобласьці: назваць архітэктурныя помнікі, знакамітыя мясьціны, вядомых людзей. Ідэя ўзьнікла яшчэ ў канцы 1990-х гг., але ў апошнія тры гады праца прасоўваецца асабліва шпаркімі крокамі. Хільмановіч таксама рыхтуе біяграфічны даведнік паўстанцаў 1863 г. Пра тое, як і за які кошт будуць друкавацца гэтыя кнігі, краязнаўца пакуль не задумваецца. "Як скончу працу, тады ўжо буду думаць пра гэта", - кажа ён.

Зэльвенскія краязнаўцы маюць магчымасьць друкаваць свае дасьледаваньні ў часопісе "Бэз", які выдае **Юры Качук.** Праўда, выходзіць ён непэрыядычна. Мясцовыя краязнаўцы падтрымліваюць кантакты з ураджэнцамі Зэльвеншчыны, якія жывуць за мяжой, маюць ад іх шмат каштоўных матэрыялаў з гісторыі краю.

Браслаўскія краязнаўцы цяпер занятыя падрыхтоўкай сёмай краязнаўчай канфэрэнцыі. Ужо тры гады ў Браславе выходзіць краязнаўчая газета **"Павет",** час ад часу выдаюцца гістарычныя зборнікі "Браслаўскія сшыткі".

Краязнаўцы Шаркаўшчыны маюць сваю газэту **"Бацькаўшчына",** якая выходзіць ужо чатыры гады. **Ада Райчонак** распавядае, што дасьледуе савецкае "раскулачваньне" сялянаў на Шаркаўшчыне ды шмат іншых тэмаў. А яшчэ яна дапамагае сваім калегам – набірае на кампутары іх тэксты.

Мікалай Анісавец з Лоева кажа, што ў суаўтарстве рыхтуе кнігу "Нарысы гісторыі Лоеўшчыны". Яе выхад прымеркаваны да 500-годзьдзя гораду, што будзе сьвяткавацца сёлета. А вось выданьне краязнаўчага бюлетэню "Карані" прыпынена, бо няма сродкаў.

Пінчукі турбуюцца, каб захаваць для нашчадкаў матэрыялы пра Палесьсе, яго памяткі і людзей. Энтузіяст **Аляксей Дуброўскі** рас-

павядае пра сваю ідэю стварэньня фатабанку пра Палесьсе, рыхтуе фотавыставу. Мае і шмат іншых цікавых ідэяў.

У Бялынічах на Магілёўшчыне штомесяц выходзіць краязнаўчая газэта **"Бялыніцкая даўніна".** За два гады былі выдадзены ўжо шэсьць выпускаў **"Бялыніцкіх сшыткаў",** якія пераважна ўяўляюць сабой матэрыялы мясцовых краязнаўчых канфэрэнцыяў, але ў іх друкаваліся і першыя спробы юных краязнаўцаў. Нядаўна намаганьнямі сябра ГА "Бялыніцкае краязнаўчае таварыства" **Анатоля Марозава** выйшла краязнаўчая кніга "Зямля Бялыніцкая".

Васіль Дубейка зь мястэчка Новая Мыш, што ў Баранавіцкім раёне, краязнаўствам займаецца з 1987 г. Вынікам ягонай шматгадовай дасьледніцкай працы, пошукаў у архівах сталіся дзевяць падрыхтаваных да друку кнігаў, прысьвечаных гісторыі Баранавіцкага раёну, знакамітым землякам і памятным мясьцінам. Але ніводная з кнігаў дагэтуль не надрукаваная: няма сродкаў. Таму краязнаўца фактычна сьвядома піша ў шуфляду, а яго дасьледаваньні маглі б зацікавіць менскіх выдаўцоў. Цяпер В. Дубейка заканчвае працу над сваёй 10-й кнігай, яна прысьвечаная тапаніміцы Баранавіцкага раёну.

А вось краязнаўца з Краснапольля, што на Магілёўшчыне, **Леанід Лабаноўскі** знаходзіць магчымасьці для выданьня сваіх кніг, якіх налічваецца ўжо каля дзясятка. Апошняя зь іх называецца "Землякі" і зьмяшчае літаратурна-краязнаўчыя партрэты знакамітых людзей Краснапольля і ваколіцаў.

Адным з найлепшых краязнаўчых выданьняў зьяўляецца часопіс **"Куфэрак Віленшчыны",** які выдае вядомы краязнаўца з Маладэчна **Міхась Казлоўскі**. У 1990-я ў маладачанскай "Рэгіянальнай газеце" выходзіла аднайменная краязнаўчая старонка, якая з часам ператварылася ў асобнае выданьне. Аднак усё трымаецца на энтузіязьме рэдактара і яго сяброў, якія зь цяжкасьцю знаходзяць сродкі, каб "Куфэрак Віленшчыны" выходзіў і зноў і зноў радаваў сваіх чытачоў цікавымі матэрыяламі.

Падрыхтавала Ганна Гапановіч

Пастаўскія выдаўцы

У сьнежні пастаўская выдавецкая ініцыятыва "Сумежжа" выпусьціла кнігу "Ваколіцы Паставаў". Новае выданьне распавядае пра помнікі прыроды, гісторыі і культуры Пастаўшчыны, зьмяшчае маршруты краязнаўчых вандровак.

Аўтарам кнігі зьяўляецца вядомы дасьледнік Віленскага краю Ігар Пракаповіч. "Ваколіцы Паставаў" сталі вынікам вандровак сяброў навуковага школьнага краязнаўчага таварыства "Ювэнта", якое дзейнічае ў Пастаўскай сярэдняй школе № 1. "Асабліва плённымі былі краязнаўчыя экспэдыцыі апошняга летняга сэзону, калі ніткі маршрутаў шчыльным павуціньнем аплялі пастаўскія ваколіцы", – піша ў прадмове аўтар выданьня.

Краязнаўцы Пастаўшчыны актыўна выпускаюць кніжкі пра мясьціны, якія некалі былі часткаю аднаго краю - Віленшчыны. Згаданыя дасьледаваньні рэгулярна выходзяць пры падтрымцы грамадзкай выдавецкай ініцыятывы "Сумежжа". З 2000 г. было выпушчана больш за пятнаццаць гістарычных, краязнаўчых і літаратурных публікацыяў розных аўтараў. Да таго ж "Сумежжа" займаецца пэрыёдыкай (напрыклад, друкуе ілюстраваны часопіс "Нашы карані", прысьвечаны даўніне Паазёр'я). А зусім нядаўна пабачыў сьвет першы нумар літаратурна-культурніцкага часопісу "Барвы".

Яраслаў Блінаў

Краязнаўчае аб'яднаньне могуць ліквідаваць

Грамадзкае аб'яднаньне "Бялыніцкае краязнаўчае таварыства" знаходзіцца пад пагрозай закрыцьця. Установа юстыцыі патрабуе ад яго кіраўніцтва знайсьці новае месца для юрыдычнага адрасу.

Адзінае на Магілёўшчыне зарэгістраванае аб'яднаньне краязнаўцаў будзе зьліквідаванае, калі да 1 сакавіка ня выканае патрабаваньняў новага Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусі, які забараняе грамадзкім аб'яднаньням мець сядзібы ў жылых памяшканьнях. Пра гэта паведаміла Абласное ўпраўленьне юстыцыі ў сваім пісьмовым папярэджаньні, вынесеным Радзе ГА "Бялыніцкае краязнаўчае таварыства". Яго кіраўнік Міхась Карпечанка, на кватэры якога афіцыйна "прапісана" гэтае НДА, мяркуе, што пасьведчаньне аб рэгістрацыі будзе скасаванае і надзеі на выратаваньне аб'яднаньня амаль не застаецца.

"Мы ўжо вычарпалі ўсе магчымасьці: ні музэй, ні бібліятэка, ніхто іншы не змаглі даць нам магчымасьці для разьмяшчэньня юрыдычнага адрасу. Цяпер толькі застаецца падпарадкавацца закону і знайсьці новую форму для нашай працы", - кажа М. Карпечанка.

Сябры аб'яднаньня ўжо вырашылі далучыцца да стварэньня рэспубліканскага краязнаўчага таварыства. Паралельна ў Бялынічах, каб не расьцярушыць дасьледчыя напрацоўкі і калектыў таварыства, будзе створаны краязнаўчы клюб, які працягне ўжо пачатую дзейнасьць. Сёньня дасьледнікі рыхтуюцца да навуковых чытаньняў, прысьвечаных лякальнай гісторыі малых мястэчак Магілёўшчыны. У чытаньнях возьмуць удзел калегі з Асіповічаў, Чэрыкава, Горак, Клімавіч і іншых гарадоў вобласьці.

Мікола Мікалайчык

Жаночая НДА з Украіны шукае партнэрскую арганізацыю ў Беларусі

Жаночая грамадзкая арганізацыя "Слобідчанка" зь вёскі Чырвоная Слабада Чаркаскай вобласьці Ўкраіны шукае партнэрскую арганізацыю ў Беларусі для наладжваньня сумеснай дзейнасьці. Меркаваныя накірункі супрацоўніцтва – культурніцкая і асьветніцкая праца, гендэрная праблематыка.

"Слобідчанка" прапануе магчымым беларускім калежанкам працу над вырашэньнем праблемы слабой грамадзкай актыўнасьці сярод жаночага насельніцтва вёсак і пасёлкаў гарадзкога тыпу, адсутнасьці ў вясковых жанчын цікаўнасьці да вырашэньня гендэрных праблемаў і г. д. Плянуецца падрыхтоўка мэтадычных дапаможнікаў па актывізацыі жаночага руху ў сельскай мясцовасьці, правядзеньне ва Ўкраіне трэнінгу для актывістаў жаночых арганізацыяў зь Беларусі, правядзеньне партнэрскімі арганізацыямі кампаніяў па абуджэньні жаночай актыўнасьці ў рэгіёнах.

Вынікам праекту павінна стаць разьвіцьцё кантактаў паміж беларускімі і ўкраінскімі жаночымі арганізацыямі, што працуюць у сельскай мясцовасьці, папулярызацыя і актывізацыя жаночага руху, перадача вопыту ад дасьведчаных - маладым арганізацыям, стварэньне мэтадычнай падтрымкі маладым жаночым арганізацыям і ініцыятывам і г. д.

Зацікаўленыя дадзенай праграмай дзейнасьці могуць зьвяртацца да Веранікі Феафілавай на e-mail: philof@uch.net

Конкурс праектаў фонду Лінды і Гары Брэдлі

Апісаньне праграмы:

Фонд Лінды і Гары Брэдлі (The Lynde and Harry Bradley Foundation) (ЗША) праводзіць конкурсы праектаў у галіне разьвіцьця пачуцьця грамадзянскасьці.

У конкурсе могуць прыняць удзел: некамэрцыйныя арганізацыі, у тым ліку ўнівэрсытэты.

Ня могуць удзельнічаць у праграме: індывідуальныя асобы.

Тэрмін прыёму заявак: да 1 сакавіка, 1 ліпеня, 1 верасьня, 1 сьнежня штогод.

Гэаграфія конкурсу: краіны СНД.

Памер гранту: ад $10000 да $55000.

У межах конкурсу будуць разглядацца заяўкі ў наступных галінах:

- эканоміка;
- палітыка;
- культура;
- грамадзянская супольнасьць.

Праекты павінны прасоўваць грамадзянскую супольнасьць да базавай ідэі выбараў і галасаваньня. Гэта могуць быць праекты, накіраваныя на павелічэньне долі грамадзкага ўдзелу, палітычныя ці акадэмічныя дасьледаваньні, праекты ў галіне СМІ і г. д.

У рамках праектаў фінансуецца:

- правядзеньне штогадовых мерапрыемстваў;
- правядзеньне канфэрэнцыяў і сэмінараў;
- набыцьцё абсталяваньня;
- агульная падтрымка;
- стажаваньні ў рамках праекту;
- інвэстыцыі, зьвязаныя з праектам;
- публікацыі;
- дасьледаваньні;
- стыпэндыі;
- разьвіцьцё адукацыйных праграмаў.

У рамках праектаў не фінансуецца: будаўніцтва і будаўнічыя работы.

Працэдура падачы заяўкі:

На першым этапе неабходна накіраваць у адрас Фонду кароткі папярэдні ліст-запыт з апісаньнем арганізацыі-заяўніцы і прапанаванага праекту.

Пасьля станоўчага адказу неабходна запоўніць форму заяўкі на ўдзел у конкурсе, якая знаходзіцца па адрасе: http://www.bradleyfdn.org

Кантактная інфармацыя:

Grants Program
The Lynde and Harry Bradley Foundation
1241 North Franklin Place
Milwaukee, WI 53202-2901

Магчымасьць навучаньня ў Італіі

Конкурс стыпэндыяў на правядзеньне дасьледаваньняў ці падрыхтоўку публікацыяў у Рыме абвяшчаецца 2 разы на год. Дэдлайн падачы заявак - 15 сакавіка і 30 верасьня. Тэматыка дасьледаваньняў - раманская культура ад пачатку раманскага пэрыяду да сучаснасьці. Галіна дасьледаваньняў - філялёгія, археалёгія, гісторыя мастацтва і г. д.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты ўнівэрсытэтаў не старэйшыя за 30 гадоў з базавым валоданьнем італьянскай мовай. Памер стыпэндыі - 750 эўра ў месяц.

Па больш падрабязную інфармацыю трэба зьвяртацца:

E-mail: lemmermann@mail.nexus.it
http://vivaldi.nuovo.nexus.it/lemmermann/index.html

"Мясцовыя партнэры для моладзі"

Таварыства "Школа Лідэраў" (Польшча), Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне "Мост", пры фінансавай падтрымцы праграмы RITA (Region in Transition) аб'яўляюць конкурс на ўдзел у праекце "Мясцовыя партнэры для моладзі".

Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца:

- асобы, якія працуюць у мясцовых органах самакіраваньня (у камісіях па справах моладзі ці адукацыі),
- дырэктары і настаўнікі сярэдніх школаў, пазашкольных дзіцячых і юнацкіх установаў,
- удзельнікі моладзевых і асьветніцкіх арганізацыяў.

У праекце ўдзельнічаюць 40 асобаў з чатырох краінаў: Беларусі, Украіны, Малдовы і Калінінградзкай вобласьці Расеі (па 10 асобаў з кожнай краіны).

Час рэалізацыі праекту: 1 сакавіка - 15 жніўня 2005 г.

Мэта праекту: навучыць прадстаўнікоў лякальных інстытуцыяў грамадзянскай супольнасьці мэханізмам будаваньня лякальнага партнэрства і мадэлям актывізацыі школьнай моладзі у малых гарадах і вёсках.

У рамках праекту адбудзецца 8-дзённае навучаньне ў Польшчы (красавік 2005 г.), падчас якога ўдзельнікі пазнаёмяцца з мэтадалёгіяй пабудовы мясцовага партнэрства і правядзеньня праграмаў актывізацыі моладзі. Праграма працоўных групаў будзе ахопліваць наступныя тэматычныя блёкі: асновы грамадзкай камунікацыі; праца ў камандзе; кіраваньне, матывацыя, праца з моладзю і валянтэрамі, дыягназ патрэбаў, плянаваньне і рэалізацыя праектаў.

Падчас навучальнага візыту ўдзельнікі пазнаёмяцца з прыкладамі моладзевых і адукацыйных праграмаў, зрэалізаваных на прынцыпах мясцовага партнэрства, і на адмысловай прэзэнтацыі вывучаць тэорыю сацыяльна заангажаванага бізнэсу.

Пасьля навучальнага візыту ўдзельнікі, абапіраючыся на ідэю лякальнага партнэрства, падрыхтуюць пляны моладзевых ініцыятываў у сваёй мясцовасьці. З прапанаваных праектаў будуць адабраныя тры найлепшыя з кожнай краіны, рэалізацыю якіх прафінансуе "Школа Лідэраў". З чэрвеня па ліпень 2005 году аўтары праектаў арганізуюць іх рэалізацыю. У жніўні адбудзецца выніковы сэмінар у Польшчы для трох удзельнікаў з кожнай краіны, якія рэалізоўвалі малыя праекты.

Удзел у праекце бясплатны, усе выдаткі аплочваюцца польскім бокам.

Дадатковая інфармацыя пра праект: (029) 7550840

Па ўзор анкеты зьвяртайцеся на факс: (017) 2055610 альбо e-mail: most@barcnews.org.

Апошні тэрмін падачы анкетаў: 30 сакавіка 2005 г.

Прэмія для журналістаў

Фонд "Памяць, адказнасьць і будучыня" (Бэрлін, Нямеччына) ў рамках Міжнароднага конкурса журналістаў абвяшчае конкурс на атрыманьне прэміі для журналістаў 2005 году.

Міжнародны конкурс журналістаў праводзіцца Фондам "Памяць, адказнасьць і будучыня" упершыню. У рамках конкурсу падтрымку атрымаюць журналісты, якія інтэнсыўна займаюцца распрацоўкай тэмы "Жэсты прымірэньня".

Сёньня ў Эўропе існуюць розныя ініцыятывы, мэтай якіх зьяўляецца ўзаемаразуменьне і прымірэньне. Конкурс мае на мэце заахвоціць маладых журналістаў дасьледаваць палітычныя, грамадзкія і рэлігійныя ініцыятывы, а таксама ініцыятывы асобных людзей, што садзейнічаюць прымірэньню, пераадоленьню варожасьці і недаверу, якія засталіся са старых часоў. Жэсты прымірэньня таксама выяўляюцца ў ініцыятывах, прысьвечаных ахвярам нацыянал-сацыялістычнай дыктатуры. Фонд заклікае маладых журналістаў адшукваць такія ініцыятывы, вывучаць і крытычна іх аналізаваць.

Лепшыя журналісцкія матэрыялы на тэму "Жэсты прымірэньня" ўзнагароджваюцца прэміяй:

1 прэмія - 2000 эўра.

2 прэмія - 1000 эўра.

3 прэмія - 500 эўра.

Прэміі будуць уручаныя восеньню 2005 г. у Бэрліне.

УМОВЫ ЎДЗЕЛУ

У конкурсе на атрыманьне прэміі могуць браць удзел журналісты ва ўзросьце ад 18 да 35 гадоў. Журналісцкія матэрыялы на тэму "Жэсты прымірэньня" павінны быць зьмешчаны ў друкаваных выданьнях альбо ў Інтэрнэт-газэтах не раней, чым у 2004 г. У асобных выпадках могуць прымацца да разгляду і не надрукаваныя матэрыялы. Яны павінны быць напісаны на мове краіны аўтара і падавацца ў іх арыгінальным варыянце (пераклад не патрабуецца). Навуковыя публікацыі на конкурс не прымаюцца.

ПАТРАБАВАНЬНІ ДА АФАРМЛЕНЬНЯ ЗАЯЎКІ НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Неабходныя для ўдзелу ў конкурсе дакумэнты павінны быць складзены на нямецкай, ангельскай альбо расейскай мовах.

Да пісьмовай заяўкі пра ўдзел у конкурсе дадаецца:

- кароткі ліст з тлумачэньнем прычынаў чаму Вы займаецеся гэтай тэмай;
- запоўнены блянк заяўкі;
- зьмястоўная аўтабіяграфія ў форме табліцы;
- Ваш журналісцкі матэрыял, што адпавядае тэме (на мове Вашай краіны);
- калі магчыма, арыгінал выданьня з гэтай публікацыяй;
- два Вашых іншых надрукаваных журналісцкіх матэрыялы (дастаткова копіяў).

Апошні тэрмін дасланьня заявак на ўдзел у конкурсе - 15 чэрвеня 2005 г.

Форма заяўкі разьмешчаная на Інтэрнэт-сайце Рэсурсовага цэнтру "Гурт": http://www.gurt.org.ua.

Больш дэталёвую інфармацыю пра конкурс можна атрымаць на Інтэрнэт-сайце Фонду "Памяць, адказнасьць і будучыня":

http://www.zukunftsfonds.de.

Кантакты:

Franka Kuhn
Programmkoordination
Stiftung Erinnerung, Verantwortung und Zukunft
Fond Erinnerung und Zukunft
InternationalerJournalistenwettbewerb
Markgrafenstraße 12-14 10969 Berlin
Тэл.: 030 25 9297 76
Факс: 030 25 9297 42
Электронная пошта:
journalistenpreis@zukunftsfonds.de

Падрыхтавана паводле:
Homel Hart News (hart.iatp.by),
www.edu.euro26.by,
www.gurt.org.ua.

“Замарожаныя” даляры

Грамадзкая арганізацыя амаль дзесяцігодзьдзе спрабуе забраць у дзяржавы свае грошы

Гісторыя, якую мы распавядзём, пачалася ў далёкім 1990 г. У той час яшчэ толькі пачынала сваю дзейнасьць грамадзкае аб’яднаньне “Беларускі сацыяльна-экалягічны саюз “Чарнобыль”. Пляны былі грандыёзныя. Напрыклад, у супрацоўніцтве зь японцамі рыхтаваліся адчыніць у Беларусі санаторыю для аздараўленьня дзяцей, пацярпелых ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. У сувязі з гэтым узьнікла патрэба ўва ўласным валютным рахунку, дзеля чаго была патрэбна невялікая сума ў валюце. Яе ў сяброў аб’яднаньня не было. Але якраз у той момант у Беларусь прыехаў дацкі пісьменьнік, якога цікавіла ўсё, што было зьвязанае з Чарнобылем. Завітаў ён і ў Беларускі сацыяльна-экалягічны саюз. Грамадзкія дзеячы распавялі госьцю пра свае праблемы.

Сёньня ўжо ніхто ня можа прыгадаць прозьвішча таго дацкага пісьменьніка. Ён па вяртаньні на радзіму даслаў беларускаму грамадзкаму аб’яднаньню пэўную суму ў дацкай валюце – атрымалася 195 амэрыканскіх даляраў. Гэтыя грошы і былі пакладзеныя на адкрыты валютны рахунак у былым “Зьнешэканамбанку”. Але праз нейкі год ляснуў Савецкі Саюз, а разам зь ім і ўсе саюзныя ўстановы, структуры. Грошы на валютным рахунку ў “Зьнешэканамбанку” былі “замарожаныя” на няпэўны час.

Час ішоў. Беларускі сацыяльна-экалягічны саюз “Чарнобыль” разбудоўваў свае структуры, адчыніў тую самую санаторыю для дзетак, выдаваў газэту. Працы хапала, і неяк пра валюту забыліся, як ні дзіўна гэта гучыць. Можа, ня верылі, што нешта можна вярнуць? Толькі ў канцы 90-х гадоў кіраўнік аб’яднаньня Васіль Якавенка напісаў міністру фінансаў Беларусі ліст, у якім запытаўся – ці ня час вярнуць грошы? А тады якраз прайшла пагалоска, што некаторыя грамадзкія арганізацыі, у якіх было “замарожана” значна больш валюты, пачалі пасьпяхова дамагацца яе вяртаньня. Зь Мінфіну прыйшоў адказ, у якім паведамлялася, што грошы ёсьць, але працэс іх вяртаньня вельмі цяжкі і марудны. Яны прапанавалі іншы варыянт – аплату гэтымі грашыма запазычанасьці грамадзкага аб’яднаньня за карыстаньне энэргарэсурсамі. Але як стварыць тую “запазычанасьць”, калі трэба штомесяц аплачваць карыстаньне энэргарэсурсамі, каб пасьля не ўзьнікалі праблемы?!

“Раней аплата за арэнду памяшканьня разьлічвалася ў далярах, а пасьля яе пачалі разьлічваць у эўра, – гаворыць **В. Якавенка.** – Наступным крокам была створана арганізацыя, якая займаецца камунальнымі паслугамі і рамонтам будынку, дзе мы здымаем пакойчык. А на рамонт грошы (“эксплюатацыйныя”) бяруць з нас! У мінулым годзе на нейкі рамонт аб’яднаньне павінна было заплаціць 300 тысяч рублёў. З 2005 г. пачынаецца рамонт даху – значыць, будуць яшчэ з нас браць. Праўда, калі заключалася дамова на арэнду, не было ўмовы, што мусім аплачваць рамонт будынку. Звычайна гэта справа і клопат гаспадара. Але яны стварылі структуру, якая жыве за наш кошт і ня робіць розьніцы, ці гэта дабрачынная арганізацыя, ці камэрцыйная. Сумы налічваюцца прапарцыянальна займанай плошчы. І калі мы аднойчы прытармазілі аплату за эксплюатацыю, дык да нас прыйшлі размаўляць адразу некалькі начальнікаў. І як тут назапашваць запазычанасьць? Пасьля гэтага нашае грамадзкае аб’яднаньне альбо выкінуць з памяшканьня, альбо павялічаць арэндную плату. А мы ж маем тут юрыдычны адрас!”

Пасьля атрыманьня адпіскі зь Мінфіну прайшло некалькі гадоў. У 2003 г. зь Міністэрства патэлефанавалі, сказалі, што шанец атры-

маць грошы ёсьць – трэба толькі сабраць некалькі дакумэнтаў. Пакуль кіраўніцтва грамадзкага аб'яднаньня іх адшукала, зь Міністэрства фінансаў паведамілі, што плян выплат у 2003 г. ужо выкананы, цяпер трэба чакаць наступнага году. А ў 2004 г. правілы гульні зьмяніліся. "Белзьнешэканамбанк" запатрабаваў ад ГА "Беларускі сацыяльна-экалягічны саюз "Чарнобыль" завераныя копіі новага статуту і пасьведчаньня аб перарэгістрацыі, новую банкаўскую картку з подпісамі кіраўніка аб'яднаньня і бухгальтара (дарэчы, з 1990 г. на гэтых пасадах працуюць адны і тыя ж людзі). Але нават калі ўсе паперы будуць падрыхтаваныя, "Белзьнешэканамбанк" валюты ня зможа выдаць. Ён мусіць перавесьці яе ў Міністэрства фінансаў, а тое альбо верне іх назад у банк – бо там быў стары рахунак аб'яднаньня, – альбо адправіць на новы рахунак...

Дакумэнты грамадзкаму аб'яднаньню трэба завяраць у натарыюса і, зразумела, не бясплатна. Пачалі лічыць. За завераньне копіі пасьведчаньня аб перарэгістрацыі – 14 400 рублёў, копіі статуту – 64800, подпісаў кіраўніка аб'яднаньня і бухгальтара – 192 000. Атрымалася больш за 270 тыс. рублёў! І што ж застанецца Беларускаму сацыяльна-экалягічнаму саюзу ад тых 195 даляраў? Хіба пара дзясяткаў даляраў. Дык ці варта тады завяраць дакумэнты? Ці ёсьць у гэтым сэнс?

Пасьля разважаньняў было вырашана паспрабаваць атрымаць завераныя дакумэнты бясплатна. Яшчэ ў 2003 г. для перарэгістрацыі аддзяленьняў Беларускага сацыяльна-экалягічнага саюзу "Чарнобыль" у рэгіёнах краіны патрэбныя былі завераныя копіі статуту і пасьведчаньня. З прычыны тых жа высокіх коштаў на паслугі натарыюса, кіраўніцтва аб'яднаньня вырашыла зьвярнуцца ў Міністэрства юстыцыі з просьбай заверыць зь дзясятак асобнікаў гэтых дакумэнтаў. Васіль Якавенка кажа, што пасьля гэтага міністар юстыцыі накіраваў запыт у Мінфін – прасіў даць яму даведку, колькі грошай знаходзіцца на рахунку аб'яднаньня. І ўрэшце адмовіў у просьбе. І вось калі кіраўніцтва ГА ў чарговы раз папрасіла Мінюст заверыць копіі дакумэнтаў, якія патрабуюцца банкам, ім ізноў адмовілі.

"Калі б у нас была нармальная краіна, дык нам, як дабрачыннай арганізацыі, чыноўнік заверыў бы дакумэнты бясплатна, – гаворыць В. Якавенка. – Бо ў іх жа нідзе не напісана, што ім забараняецца завяраць дакумэнты. А калі не забараняецца – значыць, можна!" Чыноўнікі палічылі інакш, патлумачылі, што ГА зьвярнулася не па адрасе. Грамадзкія актывісты наведалі Дзяржкамчарнобыль, спадзяваліся, што там ім дапамогуць. Але там ад іх ледзь не з парогу адмахнуліся – адфутболілі.

Атрымалася зачараванае кола. Здаецца, вось яны, грошы, але дабрацца да іх вельмі няпроста і зусім немагчыма атрымаць суму ў цэласьці. Такая бюракратычная цяганіна адбівае ў многіх жаданьне працягваць спробы вярнуць не чужое – сваё. І ствараецца дзіўная сытуацыя, калі незразумела, хто гаспадар грошай: банк, Мінфін ці грамадзкае аб'яднаньне? А можа, варта пашукаць таго дацкага ахвярадаўцу, раптам ён пагодзіцца забраць грошы назад?..

Ёсьць і яшчэ адзін цікавы аспэкт гэтай справы, на які чыноўнікі і банкіры неяк не зьвяртаюць увагі. На працягу 14 гадоў грамадзкае аб'яднаньне пазбаўленае права карыстацца сваімі грашовымі сродкамі. Але яны ж увесь гэты час не ляжалі мёртвым грузам, а, відаць, працавалі, імі хтосьці карыстаўся. І няважна, што сума на валютным рахунку Беларускага сацыяльна-экалягічнага саюзу "Чарнобыль" невялікая. Справа ня ў гэтым. Складваецца такое ўражаньне, што чыноўнікі і банкіры ня верылі, што грамадзкае аб'яднаньне зможа стаць доўгажыхаром і дажыве аж да сёньняшняга часу. І што зь ім давядзецца калісьці разьлічвацца. У такой сытуацыі яны маглі б разьлічыцца з гаспадаром грошай без усялякіх умоваў і папераў – пачалавечаму, каб нарэшце закрыць справу, якая цягнецца столькі гадоў.

Андрэй Саванец

Дзяржава адхапіла кавалак прэміі акадэміка Сахарава

У мінулым нумары "Асамблеі" мы паведамлялі пра атрыманьне Беларускай асацыяцыяй журналістаў міжнароднай прэміі імя акадэміка А. Сахарава. Як і чакалася, з выкарыстаньнем гэтых грошай (50 тыс. эўра) у грамадзкай арганізацыі ўзьніклі праблемы.

Справа ў тым, што прэзыдэнцкі дэкрэт №24, які вызначыў парадак выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі, не ўтрымлівае ніякіх выключэньняў на выпадак, падобны да сытуацыі з прэміяй Сахарава. БАЖ зьвярнуўся зь лістом у Мінюст, каб атрымаць тлумачэньне: ці зьяўляецца прэмія замежнай бязвыплатнай дапамогай, ці не. Чыноўнікі ад юстыцыі адказалі, што зьяўляецца і паведамілі, што трэба рэгістраваць прэмію ў Дэпартамэнце па гуманітарнай дзейнасьці Ўпраўленьня спраў прэзыдэнта. А на працягу 2004 г. БАЖ ужо меў два нездавальняючыя вынікі падобных зваротаў у гэтую ўстанову. Таму цяпер вялікіх надзеяў на станоўчы вынік не было.

"Адказ прыйшоў надзіва хутка, – кажа віцэ-прэзыдэнт БАЖ **Андрэй Бастунец.** – Нам паведамілі, што прэмія ўсё ж зьяўляецца ўзнагародай, а таму, калі ёсьць адпаведныя дакумэнты, можам яе выкарыстаць без рэгістрацыі ў Дэпартамэнце".

Аднак на гэтым гісторыя не закончылася. Міністэрства па падатках і зборах абавязала БАЖ выплаціць падаткі з прэміі, якую разглядала як прыбытак. Грамадзкае аб'яднаньне заплаціла падатак у памеры 24% ад агульнай сумы, пералічанай на рахунак. У выніку 12 тыс. эўра прэміі Сахарава дасталося дзяржаве.

Вінцэсь Дземянчук

1%: многа ці мала?

Як у Польшчы была загубленая добрая ідэя

Ужо год у Польшчы ў інтарэсах грамадзкіх арганізацыяў дзейнічае кампанія “1%”. Разрэклямаваная напачатку, яна паціху адышла ў цень. Звычайна так адбываецца ў выпадку правалу, бо пра няўдачы ніхто ня хоча згадваць. Каб даведацца пра сытуацыю з загадкавым “1%”, карэспандэнту “Асамблеі” давялося правесьці сапраўднае журналісцкае расьсьледаваньне.

Перад паездкай у Польшчу я ведала пра гэтую кампанію зусім няшмат. Сутнасьць яе ў тым, што кожны жыхар краіны, які сплачвае падатак на даданую вартасьць, можа накіраваць 1% свайго падатку на пэўную дзейнасьць загадзя вызначанай грамадзкай арганізацыі. Ідэя цікавая, але ці працуе гэты мэханізм? Каб даведацца пра сытуацыю з ажыцьцяўленьнем кампаніі “1%” у тамтэйшых краях, давялося прыкласьці немалыя намаганьні. Першым, да каго я зьвярнулася, быў намесьнік старшыні Малапольскага інстытуту тэрытарыяльнага самакіраваньня і адміністрацыі (MICTIA) ў Кракаве **Раман Сякеля**. Ён даў неадназначную ацэнку кампаніі “1%”. А прадстаўнікі меншых памерамі няўрадавых арганізацыяў амаль аднагалосна казалі пра тое, што яна для Польшчы хутчэй прайграная, чым пазытыўна выніковая. Чаму? Вось гэта я і спрабавала высьветліць.

На сёньняшні дзень кампанія рэалізуецца ва Ўгоршчыне, Славакіі і Літве. У Польшчы яна стартавала пазьней, рэальная ж магчымасьць прэтэндаваць на адзін адсотак падатку своеасаблівых ахвярадаўцаў у польскіх НДА існуе толькі ад 1 студзеня 2004 г. Таму з поўнай упэўненасьцю можна казаць, што польскі трэці сэктар атрымлівае першасны досьвед, якім у будучыні зможа падзяліцца і з намі.

Паводле аднога з сацыялягічных дасьледаваньняў, праведзеных у 2002 г., 62,9% ад агульнай колькасьці няўрадавых арганізацыяў пазытыўна ацанілі магчымасьць увядзеньня практыкі адлічэньняў 1% на грамадзкую дзейнасьць. Але гэтая лічба нікога з аналітыкаў польскага трэцяга сэктару тады не зьдзівіла, бо 78% з усіх НДА назвалі сваёй галоўнай праблемай недахоп фінансаваньня. Натуральна, што кожную магчымасьць атрыманьня дадатковага фінансаваньня трэці сэктар мог толькі вітаць. Але адназначных ацэнак таго, што з гэтага атрымліваецца, пакуль ніхто не дае. І гэта нядзіўна, бо рэальныя грошы арганізацыі змогуць атрымліваць толькі цяпер, у 2005 г.

З 1 студзеня 2004 г. пачаў дзейнічаць *Ustawa o działalności pożytku publicznego i o wolontariacie* — Закон аб грамадзка карыснай дзейнасьці і валянтарыяце. У дакумэнце запісана, што кожны, хто сплачвае падатак на даданую вартасьць, можа накіраваць 1% свайго падатку на дзейнасьць адной з НДА Польшчы. Аднак існая працэдура ў многіх палякаў адбівае жаданьне скарыстацца з новаўвядзеньня. Справа ў тым, што на пачатку году падаткаплатнік мусіць паведаміць пра сваё жаданьне падтрымаць грамадзкую арганізацыю падатковым органам, а тыя, адпаведна, мусяць пералічыць грошы на рахунак арганізацыі па завяршэньні справаздачнага пэрыяду. Гэта значыць, калі ў студзені 2004 г. я сказала, што хачу 1% свайго падатку накіраваць на дзейнасьць пэўнай арганізацыі, то падатковыя органы пералічаць гэтыя грошы ў сакавіку ці красавіку 2005-га! — і толькі пасьля атрыманьня ад мяне дэклярацыі аб сукупным гадавым прыбытку, вылічэньня памеру агульнага падатку, вылічэньня памеру 1% ад майго агульнага падатку і фактычнага атрыманьня грошай ад мяне. Пры гэтым падаткаплатнік мусіць рабіць абавязковую спасылку пра сваё жаданьне перавесьці грошы НДА ў гадавой дэклярацыі. У той жа дэклярацыі ён мусіць пазначыць дакладныя рэквізіты няўрадавай арганізацыі...

Высьвятляецца, што і ня кожная грамадзкая арганізацыя можа стаць атрымальнікам 1% падатковых грошай. Для таго каб мець права іх атрымліваць, трэба прайсьці рэгістрацыю ў якасьці арганізацыі *pożytku publicznego,* у дакладным перакладзе — “арганізацыі грамадзкай важнасьці/карысьці”. У лік гэтых “абраных” патрапілі НДА, якія ў адпаведнасьці з сваімі статутнымі мэтамі фактычна выконваюць сацыяльныя замовы ад органаў мясцовага самакіраваньня на карысьць агульных грамадзкіх інтарэсаў. Дзейнасьць такіх арганізацыяў рэгулюецца згаданым Законам. Гэты дакумэнт абавязвае мясцовыя органы самакіраваньня супрацоўнічаць з грамадзкімі арганізацыямі, апісвае некаторыя прэфэрэнцыі арганізацыяў грамадзкай важнасьці, але і накладае на гэтыя арганізацыі шэраг абмежаваньняў. Напрыклад, у адрозьненьне ад звычайных НДА, арганізацыі грамадзкай важнасьці маюць абмежаваньні на выкарыстаньне прыбытку ад гаспадарчай дзейнасьці — яны могуць выкарыстоўваць прыбытак толькі на пэўныя мэты. Да таго ж пэўным чынам абмяжоўваецца аб’ём гаспадарчай дзейнасьці арганізацыі грамадзкай важнасьці, але падатковых прэфэрэнцыяў яна не атрымлівае.

Памятаючы пра абмежаваньні і пэўныя нязручнасьці, якія будзе

мець сярэднестатыстычны польскі "ахвярадаўца" на карысьць грамадзкай арганізацыі, варта падлічыць памер "ахвяраваньня". Сярэдні памер агульнага падатку, які сплачвае шараговы паляк, складае каля 450 даляраў. Адпаведна, адзін адсотак ад гэтай сумы - 4,5 даляры. Атрымліваецца, што ад аднаго грамадзяніна арганізацыя праз мэханізм 1% можа атрымаць 4,5 даляра ў год. Няшмат. Хтосьці скажа, што гэтая сума павялічваецца прапарцыянальна колькасьці "ахвярадаўцаў" і іх можа быць не адзін-два, а 20, 50, 100... У выпадку, калі сто грамадзянаў пералічаць на дзейнасьць "арганізацыі грамадзкай важнасьці" 1% сваіх падаткаў, сума атрымліваецца не такая ўжо малая. Але тут нельга забываць пра тое, што сама арганізацыя таксама сплачвае падаткі, якія часта перавышаюць ахвяраваньні, якія можна атрымаць праз згаданы мэханізм.

Як бачыце, казаць штосьці адназначнае пра гэтую кампанію цяжка. Ёсьць у ёй свае плюсы, напрыклад тое, што дзякуючы наяўнасьці такога мэханізму дапамогі трэцяму сэктару незаангажаваныя ў грамадзкую дзейнасьць палякі могуць зрабіць свой унёсак на карысьць разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці. Але ёсьць і мінусы, якія збольшага абумоўліваюцца бюракратычнымі працэдурамі, яшчэ не выкараненымі ў Польшчы.

У канцы артыкулу я не хацела б даваць пэўных ацэнак мэханізму 1% на польскім прыкладзе. Мяркую, што пра стаўленьне польскіх няўрадавых арганізацыяў да спробы заахвоціць іх праз мэханізм 1% да супрацы з органамі мясцовага самакіраваньня і разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці красамоўна скажуць лічбы: з больш чым 4000 грамадзкіх аб'яднаньняў, зарэгістраваных у Малапольскім ваяводзтве, толькі каля 100 прайшлі рэгістрацыю ў якасьці арганізацыяў грамадзкай важнасьці.

Алёна Андрэева

Пры падрыхтоўцы артыкулу выкарыстаныя матэрыялы з кнігі Радаслава Скібы *"NGO. Ustawa o działalności pożytku publicznego i o wolontariacie. Poradnik dla organizacja pozarzandowych"*.

Новае агульнапольскае выданьне няўрадавых арганізацыяў

На пачатку 2005 г. у Варшаве пабачыў сьвет першы нумар квартальніка "Trzeci Sektor**".**

Заснавальнікам часопісу зьяўляецца Фундацыя "Інстытут спраў публічных" пры партнэрскім удзеле вядомых польскіх няўрадавых арганізацыяў: Акадэміі разьвіцьця дабрачыннасьці ў Польшчы, Фундацыі разьвіцьця мясцовай дэмакратыі, Сеткі няўрадавых арганізацыяў "SPLOT", Фундацыі "Партнэрства для асяродку", Аб'яднаньня "Клён/Явор". Гэтыя арганізацыі аб'ядналі свае інтэлектуальныя рэсурсы для стварэньня новага пэрыёдыку і напаўненьня яго актуальным, карысным і высакаякасным зьместам.

Галоўны рэдактар часопісу Марэк Рымша адзначае, што "**Trzeci Sektor**" будзе імкнуцца прыцягваць да абмеркаваньня праблемаў разьвіцьця няўрадавага сэктару шырокае кола экспэртаў, ствараючы пляцоўку для абмеркаваньня пэрспэктываў польскай грамадзянскай супольнасьці. Дэбаты і трансьляцыя экспэртных меркаваньняў - вось аснова новага выданьня.

Праграмная рада часопісу заяўляе пра намер будаваць зьмест кожнага тому квартальніка на аснове актуальных для арганізацыяў тэмаў. Першы нумар прысьвечаны падатковаму аспэкту ў дзейнасьці структураў грамадзянскага сэктару. Тэмы будуць асьвятляцца ў некалькіх вымярэньнях: праз публікацыю разгорнутых меркаваньняў альбо кароткіх заўвагаў вядомых дзеячоў "трэцяга сэктару", аўтарытэтных экспэртаў і дасьледнікаў; праз рэгулярнае асьвятленьне зьменаў у заканадаўстве, што наўпрост альбо ўскосна ўплываюць на стан няўрадавых арганізацыяў; праз рэцэнзаваньне выданьняў, што робяцца няўрадавымі арганізацыямі альбо для няўрадавых арганізацыяў; праз тэматычныя артыкулы і матэрыялы дыскусіяў. Падобны шматбаковы разгляд тэмаў будзе спрыяць грунтоўнаму тэарэтычнаму і практычнаму вывучэньню праблемаў "трэцяга сэктару" і можа ўяўляць цікавасьць ня толькі для польскіх арганізацыяў, але і для грамадзкіх актывістаў зь іншых краінаў.

Стварэньне часопісу стала адным з этапаў рэалізацыі праекту "Пабудова спрыяльнага навакольля для няўрадавых арганізацыяў - KOMPAS", што ажыцьцяўляецца Фундацыяй "Інстытут спраў публічных" пры фінансавай падтрымцы Фундацыі Баторага і Трэсту для грамадзянскай супольнасьці ў Цэнтральнай і Усходняй Эўропе.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

Kwartalnik "Trzeci Sektor"
Fundacja Instytut Spraw Publicznych
Ul. Szpitalna 5 lok. 22
0-031 Warszawa
tel. (22) 5564273, fax. (22) 5564262
kwartalnik@isp.org.pl
www.isp.org.pl

Юрысты НДА рыхтуюцца

Працяг са стар. 4

Стварэньне неспрыяльных варункаў для недзяржаўнага сэктару – адна з мэтаў гэтага законапраекту. Збольшага зьмены толькі пацьвярджаюць *de jure* тое, што ўжо пэўны час існавала *de facto* (гэта тычыцца патрабаваньняў аб штогадовай справаздачнасьці, аб пашырэньні магчымасьцяў ліквідацыі грамадзкіх аб'яднаньняў, стварэньня арганізацыйных структураў). Як і раней, застаецца нефармалізаваным статус камісіі па рэгістрацыі і перарэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў.

У той жа час у праекце закону ёсьць і новыя моманты, пераважная большасьць якіх датычыць фармалізацыі стварэньня і дзейнасьці саюзаў і асацыяцыяў грамадзкіх аб'яднаньняў. Уводзяцца новыя захады прыпыненьня дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў – яны прадугледжаныя законам, аднак недастаткова выразныя; у інстытуце прыпыненьня дзейнасьці застаецца шмат незразумелых момантаў. Гэта можа мець нэгатыўныя наступствы для беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў.

ПАГРОЗА ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ

Новая рэдакцыя Закону пагаршае прававы клімат для дзейнасьці НДА, аднак больш істотнай небясьпекай зьяўляецца магчымае абвяшчэньне перарэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў. Вялікай праблемай зьяўляецца адсутнасьць юрыдычных адрасоў: амаль сто грамадзкіх аб'яднаньняў не змаглі знайсьці да 1 лютага юрыдычнага адрасу ў нежылым памяшканьні і, такім чынам, яны нават не патрапяць пад перарэгістрацыю (аўтаматычная страта рэгістрацыі). Некаторыя выступоўцы адзначылі, што грамадзкія арганізацыі рызыкуюць выдаткаваць свае рэсурсы на перарэгістрацыю, што зашкодзіць іх дзейнасьці напярэдадні і падчас выбарчай кампаніі (карэкцыя ўласнай дзейнасьці). Магчыма, мэтазгодна сьвядома пераходзіць да дзейнасьці ў незарэгістраваным фармаце, аднак гэта пагражае грамадзкім актывістам прыцягненьнем да адміністрацыйнай адказнасьці.

Што мы можам зрабіць, каб паўплываць на працэс прыняцьця новай рэдакцыі закону? Падчас круглага стала гучалі наступныя прапановы:

- грамадзянская кампанія з шырокім колам удзельнікаў (як новы этап кампаніі "Наша салідарнасьць");
- актыўныя грамадзянскія дзеяньні (пікеты і інш.);
- параўнаўча-прававы аналіз заканадаўства з шырокім распаўсюджаньнем яго вынікаў і давядзеньнем іх да ведама парлямэнтароў;
- праца з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў з улікам досьведу лёбінгавай дзейнасьці па праблеме зьменаў у Законе аб веравызнаньнях у 2002 г.

Прагучала прапанова байкатаваць рэгістрацыю, аднак большасьць удзельнікаў з гэтым варыянтам не пагадзілася.

Падчас дыскусіі былі выказаныя розныя меркаваньні адносна магчымасьцяў уплыву НДА на працэс прыняцьця новай рэдакцыі Закону Рэспублікі Беларусі "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях". Удзельнікі неаднаразова заўважалі, што мэханізмы ўплыву на гэты працэс у НДА вельмі слабыя. Прапаноўваліся розныя мэтады прыцягненьня грамадзкай увагі да праблемы (звароты да дэпутатаў, шырокая дыскусія ў СМІ, пікетаваньне і г. д.).

АБМЕН І КААРДЫНАЦЫЯ

Падчас пленарнага паседжаньня і працы ў малых групах па такіх напрамках, як праблема юрыдычных адрасоў для некамэрцыйных арганізацыяў, інфармацыйны абмен і каардынацыя працы юрыстаў, сумесныя асьветніцкія дзеяньні і кансультацыі, адбыліся працяглыя дыскусіі. Вынікам абмеркаваньня сталі прапановы па паляпшэньні ўзаемадзеяньня юрыстаў, якія аказваюць дапамогу некамэрцыйным арганізацыям у Беларусі, і варыянты дзеяньняў у выпадку абвяшчэньня чарговай перарэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў.

Адна з групаў – "Арганізацыя прававой дапамогі грамадзкім аб'яднаньням у пэрыяд перарэгістрацыі: інфармацыйны абмен і каардынацыя" – прыйшла да наступных высноваў.

У выпадку абвяшчэньня перарэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў кансультацыйная дзейнасьць юрыстаў мусіць быць арганізаваная на базе ўжо дзейных сетак юрыстаў, але найперш яна павінна абапірацца на асобаў, якія вядомыя ў сваіх рэгіёнах сваёй кваліфікацыяй ды маюць аўтарытэт у колах трэцяга сэктару. Сыстэма кансультаваньня і дапамогі падчас перарэгістрацыі павінна фармавацца на лякальнай базе з улікам становішча ў канкрэтнай мясцовасьці.

Найбольш прыдатным для такой працы ўяўляецца фармат шырокай грамадзянскай кампаніі, напрыклад, як кампанія "Наша салідарнасьць". Пры гэтым кансультацыйныя паслугі павінны аказвацца ўсім грамадзкім аб'яднаньням, незалежна ад іх палітычнай пазыцыі і дачыненьняў з уладамі.

Досьвед працы павінен стаць важным складнікам інфармацыйнага абмену. Найперш сытуацыя вымагае распаўсюду выпадкаў удалай працы юрыстаў і пасьпяховых стратэгіяў абароны. У выпадку абвяшчэньня перарэгістрацыі мэтазгодна стварыць адзіную рэгулярную рассылку. Магчыма, варта было б стварыць аб'яднаную рассылку аб правах грамадзкіх аб'яднаньняў, якая б зьмяшчала аналіз заканадаўства, навіны заканадаўства, досьвед практычнай працы альбо нават і казусы. Галоўную функцыю ў каардынацыі інфармацыйнага абмену павінны выконваць кансультацыйныя цэнтры зь Менску.

Вонкавую інфармацыйную працу трэба скіраваць на беларускае грамадзтва і на міжнародную су-

польнасьць. Павінна быць наладжана шчыльнае ўзаемадзеяньне зь беларускімі мэдыямі, асабліва з папулярнымі рэгіянальнымі газэтамі.

Неабходна працягваць маніторынг парушэньняў правоў грамадзкіх аб'яднаньняў, які цяпер ажыцьцяўляецца ў межах кампаніі "Наша салідарнасьць". Эфэктыўным сродкам збору інфармацыі пра стан НДА можа быць кансультацыйная дзейнасьць мясцовых юрыстаў. Таксама трэба выкарыстоўваць афіцыйныя крыніцы інфармацыі (матэрыялы дзяржаўных органаў) і дзяржаўныя СМІ. Прадуктыўным зьяўляецца аналіз паведамленьняў прэсы і інтэрнэт-сайтаў, але іх паведамленьні трэба правяраць шляхам простых кантактаў з арганізацыямі.

ПРАБЛЕМА ЮРЫДЫЧНЫХ АДРАСОЎ

Удзельнікамі дыскусіі ў групе "Арганізацыя прававой дапамогі грамадзкім аб'яднаньням у пэрыяд перарэгістрацыі: юрыдычныя адрасы" былі разгледжаныя варыянты пошуку юрыдычных адрасоў з улікам досьведу, які ўжо ёсьць пасьля патрабаваньня іх перарэгістрацыі да 1 лютага 2005 г. Былі выяўленыя два кірункі афармленьня юрыдычных адрасоў: арэнда нежылых памяшканьняў і выкарыстаньне аднакватэрных блёкавых дамоў.

Самай праблемнай зьяўляецца арэнда нежылых памяшканьняў. Удзельнікі абмеркаваньня канстатавалі нежаданьне мясцовых органаў улады садзейнічаць грамадзкім аб'яднаньням у атрыманьні юрыдычных адрасоў у камунальным жыльлёвым фондзе. Разьмяшчэньне юрыдычных адрасоў у прыватных адміністрацыйных будынках (часьцей за ўсё яны належаць прадпрымальнікам, вельмі рэдка – прыватным асобам) магчымае, аднак тут існуе цэлы шэраг праблемаў: уладам няцяжка знайсьці фармальныя перашкоды для забароны разьмяшчэньня арганізацыі (пажарная, санітарная бясьпека, аварыйны стан будынку) альбо аказаць ціск на ўласьніка памяшканьня (гэта асабліва характэрна для разьмяшчэньня структураў палітычных партыяў, але не абмінае і грамадзкія аб'яднаньні).

Пад юрыдычныя адрасы падыходзяць ня толькі адміністрацыйныя памяшканьні, але й іншыя памяшканьні нежыльлёвага фонду (сутарэньні, калясачныя, дапаможныя памяшканьні і нават складзкія і гандлёвыя плошчы). Іх трэба актыўна шукаць, а не спадзявацца на ласку мясцовых уладаў, у тым ліку пры дапамозе базы зьвестак, якая фармуецца падчас гарадзкіх аўкцыёнаў дзеля продажу права арэнды нежылых памяшканьняў (маюць права браць удзел як ГА, так і фізычныя асобы).

Абмяркоўвалася таксама і праблема выкарыстаньня аднакватэрных блёкавых дамоў.

Былі прынятыя наступныя рэкамэндацыі:

1. Стварэньне базы зьвестак даступных аднакватэрных дамоў і магчымых юрыдычных адрасоў, якія сыстэматызуюцца і даюцца на агульнае карыстаньне.
2. Праца з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.
3. Кампанія працы з выканкамамі.
4. Зварот ад грамадзянаў у Канстытуцыйны суд па пытаньні адпаведнасьці нормаў ГК і ЖК Беларусі. Той факт, што ўнітарныя прадпрыемствы маюць права рэгістрацыі ў кватэрах, а НДА такога права пазбаўленыя, ёсьць дыскрымінацыяй некамэрцыйных юрыдычных асобаў.
5. Зварот у Палату прадстаўнікоў з просьбай афіцыйнага тлумачэньня тэрміну "юрыдычны адрас".
6. Арганізацыя судовых пазоваў пасьля 1 лютага 2005 г. у выпадку пазбаўленьня рэгістрацыі арганізацыйных структураў рашэньнямі органу рэгістрацыі.
7. Звароты ў Дэпартамэнт № 4 АБСЭ, які створаны для кантролю за рэалізацыяй права на асацыяцыю ў краінах АБСЭ.

Дадатковымі спосабамі афармленьня юрыдычных адрасоў зьяўляюцца набыцьцё нежылых памяшканьняў ува ўласнасьць арганізацыі, набыцьцё нежылых па-

Алена Танкачова,
старшыня Інавацыйнага фонду прававых тэхналёгіяў:

– У гэтага мерапрыемства ёсьць некалькі мэтаў. З аднаго боку, мы шчыра спадзяёмся, што юрысты ў большай колькасьці, чым гэта ёсьць цяпер, прымуць удзел у маніторынгавай працы, якую вядзе Асамблея. Таксама мы супольна будзем больш плённа працаваць у кампаніі калектыўнай абароны няўрадавых арганізацыяў. Мы спадзяёмся, што юрысты ўступяць у этап аказаньня юрыдычных паслугаў больш падрыхтаванымі і больш аб'яднанымі. Гэта будзе патрэбна ў выпадку абвяшчэньня перарэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў. Таксама мы спадзяёмся, што сьпіс зьменаў у нацыянальнае заканадаўства атрымае сваё рэальнае шырокае абмеркаваньне ў прафэсійнай юрыдычнай супольнасьці.

Я мяркую, што ў палітычным пляне гэты час, безумоўна, этапны. Нас чакаюць вядомыя палітычныя падзеі – прэзыдэнцкія выбары. Права ў дадзеным выпадку зьяўляецца сродкам для вырашэньня задачаў, якія стаяць перад уладамі. Ні для кога не сакрэт, што падчас буйных кампаніяў адзін з элемэнтаў дзяржаўнай працы – гэта дыскрэдытацыя дзейнасьці грамадзянскай супольнасьці, дыскрэдытацыя апазыцыйна скіраваных арганізацыяў. Ствараюцца такія прававыя абмежаваньні і ўмовы працы, якія адцягваюць прававое грамадзтва ад уласна грамадзкай працы. Арганізацыі пазбаўленыя магчымасьці выконваць свае мэты і задачы. Такім чынам дзяржава памяншае колькасьць грамадзкаактыўных асобаў і арганізацыяў, выключае іх з грамадзка-палітычнага працэсу. Арганізацыі і юрысты занятыя такімі справамі, як юрыдычныя працэдуры, суправаджэньне перарэгістрацыі і г.д.

мяшканьняў ува ўласнасьць сяброў арганізацыі (абодва варыянты вымагаюць вялікіх фінансавых выдаткаў).

ПРАВАВАЯ ДАПАМОГА

Доступ да прававой дапамогі застаецца актуальнай праблемай для НДА. У сувязі са зьменамі юрыдычных адрасоў грамадзкія аб'яднаньні стаяць перад неабходнасьцю ўнясеньня зьменаў у статутныя дакумэнты. Прыняцьце новай рэдакцыі Закону Рэспублікі Беларусі "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях" паставіць шэраг НДА перад неабходнасьцю дапасаваньня дакумэнтаў да новых патрабаваньняў заканадаўства. Гэтыя і іншыя праблемы абмяркоўвала група "Арганізацыя прававой дапамогі грамадзкім аб'яднаньням у пэрыяд перарэгістрацыі: сумесныя асьветніцкія дзеяньні і кансультаваньне".

Ня выключана, што ўлады абвесьцяць агульную перарэгістрацыю грамадзкіх аб'яднаньняў. Арганізацыя прававой дапамогі ў пэрыяд перарэгістрацыі НДА патрабуе сумесных, скаардынаваных дзеяньняў з боку юрыстаў, якія аказваюць паслугі грамадзкім аб'яднаньням, а таксама ўцягваньня ў гэтую працу прафэсійных юрыстаў з усёй краіны. Каардынацыйныя функцыі могуць выконвацца ў межах кампаніі "Наша салідарнасьць" і сыстэмы Калектыўнай абароны.

На думку ўдзельнікаў групы, доступ да прававой дапамогі грамадзкім арганізацыям у пэрыяд перарэгістрацыі можна палегчыць у выніку:

- скаардынаванай асьветніцкай і кансультацыйнай дзейнасьці юрыстаў для прадстаўнікоў НДА;
- каардынацыі дзеяньняў і абмену досьведам паміж юрыстамі, якія практыкуюць для гэтай мэтавай групы.

У выпадку абвяшчэньня перарэгістрацыі трэба:

- правесьці супольны трэнінг для юрыстаў па прававых аспэктах перарэгістрацыі;
- сфармаваць групу трэнэраў, якія забясьпечаць правядзеньне асьветніцкіх сэмінараў на тэму перарэгістрацыі ў рэгіёнах;
- падтрымліваць абмен інфармацыяй сярод юрыстаў у пэрыяд перарэгістрацыі (электронная рассылка, інтэрнэт-форум);
- правесьці трэнінг і стварыць міжрэгіянальную групу юрыстаў па падрыхтоўцы скаргаў у Камітэт ААН па правах чалавека.

Арцём Лява

Прэзэнтацыя вэбсайту Інавацыйнага Фонду прававых тэхналёгіяў

ІНТЭРНЭТ-РЭСУРС

У той жа дзень адбылася прэзэнтацыя інтэрнэт-рэсурсу Інавацыйнага Фонду прававых тэхналёгіяў (http://nopi.iatp.by), на якім створаны разьдзел "Права НДА", прысьвечаны прававому аспэкту дзейнасьці некамэрцыйных арганізацыяў. Стваральнікі чакаюць, што для юрыстаў гэты рэсурс стане пляцоўкай для далейшай прафэсіяналізацыі прававой дапамогі некамэрцыйным арганізацыям. Падчас працы круглага стала асобна адбылася майстар-кляса "Прававы стан некамэрцыйных арганізацыяў: праблемныя зоны", у якой узялі ўдзел 11 юрыстаў, большасьць зь якіх прадстаўлялі Асацыяцыю маладых юрыстаў. Мадэратарам была Вольга Смалянка. Адбылася інтэнсіўная прафэсійная дыскусія аб асобных аспэктах стварэньня і дзейнасьці некамэрцыйных арганізацыяў у Беларусі.

Падрыхтавалі
Юры Арлоўскі, Аксана Вайтовіч
і Ядвіга Мацкевіч

Юры Чавусаў,
юрыст Выканаўчага бюро Асамблеі НДА:

– Мы хацелі сабраць усіх юрыстаў, якія працуюць з грамадзкімі арганізацыямі, дапамагаюць ім. Важна дадаткова наладзіць зь імі сувязь і абмеркаваць цяперашнюю сытуацыю з імаверным прыняцьцем новай рэдакцыі Закону аб грамадзкіх аб'яднаньнях. Паразмаўляць пра нашыя магчымыя дзеяньні ў выпадку прыняцьця гэтага закону. На сустрэчы прысутнічалі каля 60 чалавек. Гэта найперш юрысты, якія аказваюць дапамогу ня толькі сваім арганізацыям, але і некаторым іншым аб'яднаньням. Большасьць прысутных – прадстаўнікі рэгіёнаў. Таксама ёсьць сябры Асацыяцыі маладых юрыстаў.

МЕНСК

Ліквідаваны жаночы рух “Адраджэньне Айчыны”

21 лютага судзьдзя Вярхоўнага суду Беларусі Сакалоўская прыняла рашэньне пра ліквідацыю грамадзкага аб’яднаньня “Беларускі жаночы рух “Адраджэньне Айчыны”. Падставай для ліквідацыі сталі знойдзеныя кансультантам Міністэрства юстыцыі А. Харытонам памылкі ў вядзеньні справаводзтва і ў афармленьні пратаколаў кіраўнічага органу арганізацыі, а таксама няўчасная падача Мінюсту запатрабаванай інфармацыі пра дзейнасьць аб’яднаньня.

Акрамя таго, у судовым рашэньні сьцьвярджаецца, што арганізацыя парушыла нормы ўласнага статуту падчас арганізацыі і правядзеньня ў сьнежні мінулага году круглага стала “Пытаньні гендэрнага балянсу ў сучасным грамадзтве”, а таксама падчас абмеркаваньня на паседжаньні ўласнай Управы пытаньняў выхаваўчай працы зь дзецьмі.

Як адзначае кіраўнічка БЖР “Адраджэньне Айчыны” Зінаіда Ганцук, з самага пачатку быў зразумелы характар будучага судовага рашэньня. “Нам вядома, што існуе загад на ліквідацыю нашай арганізацыі ў сувязі з пэўнай нашай актыўнай дзейнасьцю. Таму мы нават і не імкнуліся ў судзе пабудаваць нейкую стратэгію ўласнай абароны, паколькі наяўнасьць палітычнай замовы робіць другараднымі ўсе юрыдычныя аспэкты справы. Ведаючы, што ніводнае з грамадзкіх аб’яднаньняў ня здолела адстаяць у судзе права на існаваньне, мы ня лічым мэтазгодным актыўна процістаяць ужо фактычна прынятаму рашэньню аб ліквідацыі. Аспрэчым гэтыя падставы — дык адразу паўстануць новыя і новыя прэтэнзіі”, - сказала спадарыня З. Ганцук у размове з карэспандэнтам belngo.info.

Варта адзначыць, што суддзя Сакалоўская ўжо адзначылася ліквідацыяй у 2001 г. Моладзевага інфармацыйнага цэнтру.

Юры Патоцкі

“Рада” вінная дзяржаве 125 мільёнаў рублёў

Паводле вынікаў праверкі Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб’яднаньняў “Рада” падатковая інспэкцыя Цэнтральнага раёну Менску пастанавіла спагнаць з арганізацыі нявыплачаныя падаткі, эканамічныя санкцыі і пеню. Агульная сума прэтэнзіяў падаткавікоў да “Рада” перавышае 125 млн. рублёў - гэта рэкордныя эканамічныя санкцыі супраць беларускіх няўрадавых арганізацыяў.

Падставы для такіх вялікіх штрафаў былі знойдзеныя намесьнікам начальніка падатковай інспэкцыі Цэнтральнага раёну сталіцы В. Мірановічам і падатковым інспэктарам Е. Пшанічнай падчас мінулагоднай праверкі арганізацыі. Падаткавікі прыйшлі да высновы, што ў 2002 і 2003 гг. “Рада” беспадстаўна не плаціла падаткаў зь міжнароднай тэхнічнай дапамогі, атрыманай ад Эўрапейскай камісіі па праграме TACIS і ад Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў па праграме ЮНІСЭФ.

Пікантнасьць сытуацыі палягае ў тым, што ў мінулым годзе падобныя падатковыя прэтэнзіі адносна сродкаў праграмы TACIS былі высунутыя супраць грамадзкіх аб’яднаньняў “Беларускі Хельсынскі камітэт” і “Воля да разьвіцьця” (Слонім). Тады ўсе судовыя інстанцыі прызналі, што сродкі TACIS скарыстоўваюцца паводле беларускага заканадаўства ў беспадатковым рэжыме і арганізацыі цалкам законна не плацілі падаткаў з атрыманых грантаў.

Аднак назіральнікі пры гэтым адзначалі, што такая спрыяльная для грамадзкіх структураў пазыцыя суду была выкліканая тым, што кіраўніцтва праграмы TACIS пагражала ў адваротным выпадку ўвогуле спыніць выдзяленьне дапамогі Беларусі, у тым ліку і дзяржаўным структурам, нават па праграме фінансаваньня пераабсталяваньня беларускай памежнай інфраструктуры (толькі гэтая праграма складае больш за 16 млн. эўра). Цяпер дадзеная праграма канчаткова зацьверджаная, зацьверджаны і плян працы TACIS у Беларусі на наступныя гады. Напэўна, падаткавікі вырашылі прынцыпова завалодаць грашыма, што былі пералічаныя эўрапейскімі структурамі беларускім няўрадавым арганізацыям.

Таксама цікавым момантам зьяўляецца тое, што нядаўна ў “Радзе” зьмянілася кіраўніцтва: старшынёй арганізацыі стала Сьвятлана Каралёва, якая выразна акцэнтавала палітычны аспэкт у дзейнасьці “Рады”. Нагадаем, што прэзыдэнт Лукашэнка назваў гэтую арганізацыю “дзіравым парасонам”, які перашкаджае працы БРСМ. Тым ня менш, парушэньні, якія быццам бы дапусьціла “Рады”, адносяцца да часоў, калі арганізацыю ўзначальвала папярэдняя старшыня - Яніна Зінчанка.

“TACIS-гейт” працягваецца. Відавочна, што гэта далёка не апошняя ахвяра падаткавікоў, рукамі якіх грамадзкія актывісты ператвараюцца ў небясьпечных злачынцаў: тэхнічную дапамогу і гранты па легальных каналах атрымлівала вялікая колькасьць арганізацыяў.

Юры Чавусаў

ВІЦЕБСК

Юбілей клюбу “За дэмакратычныя выбары”

Споўнілася 15 гадоў з дня заснаваньня адной з найстарэйшых недзяржаўных арганізацыяў Віцебску - гарадзкога клюбу выбарцаў “За дэмакратычныя выбары”. З нагоды юбілейнай даты сябры клюбу зладзілі 18 студзеня адмысловую сустрэчу, на якой узгадалі гісторыю разьвіцьця грамадзкага аб’яднаньня.

Ідэя стварэньня клюбу ўзьнікла ў дэмакратычна настроеных колах напярэдадні выбараў 1990 г. у Вярхоўны Савет БССР. Ініцыятыва хутка знайшла прыхільнікаў, неўзабаве клюб аб'яднаў звыш за 60 чалавек. Група, у якую першапачаткова ўваходзілі прадстаўнікі БНФ, камуністы і беспартыйныя, стала моцным штуршком для разьвіцьця палітычнай і грамадзкай актыўнасьці ў горадзе. "Улады пабачылі нашыя ўплывы. Ужо ў сакавіку 1990 г. клюб быў зарэгістраваны", - прыгадвае **Барыс Хамайда,** адзін з заснавальнікаў і лідэраў арганізацыі.

Значэньне грамадзкага аб'яднаньня хутка ўзрастала. У 1992 г. праца арганізацыі набыла рэгіянальны характар: клюб стаў выпускаць афіцыйна зарэгістраваную газэту "Выбар", якая распаўсюджвалася на Віцебшчыне. У сярэдзіне 1990-х гг. пачаўся перасьлед уладамі сяброў клюбу. Моцны палітычны ціск змусіў спыніць колішнюю актыўнасьць. "Мы былі вымушаныя закансэрваваць сваю дзейнасьць", - гаворыць Б. Хамайда.

Тым часам ён лічыць, што мэта дзейнасьці клюбу пакуль ня выканана: "У Беларусі так і не ўсталяваўся прынцып свабодных, справядлівых выбараў. Вяртаньне да Канстытуцыі 1994 г. адчыніць шлях дэмакратызацыі. Так што наша праца яшчэ наперадзе".

Яраслаў Блінаў

Дэмакратычная грамадзкасьць супраць АЭС

27 лютага ў цэнтры Віцебску прайшоў несанкцыянаваны пікет, у якім узялі удзел каля 40 сябраў шэрагу дэмакратычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў. Яны пратэставалі супраць магчымага будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі.

Удзельнікаў акцыі моцна турбуюць магчымыя экалягічныя і эканамічныя наступствы пабудовы АЭС. "Мяркуецца, што адыходы ад працы АЭС могуць захоўвацца на Пастаўшчыне, у шахтах ракетных установак. Гэта паставіць крыж на разьвіцьці эка- і агратурызму на захадзе Віцебскай вобласьці. У выніку гэтага ў будучыні бюджэт не атрымае паступленьні ад пэрспэктыўнай галіны", - лічыць старшыня рэгіянальнага аддзяленьня Фонду імя Льва Сапегі Хрыстафор Жэляпаў.

photo.bymedia.net

Аднак гэта толькі адна з магчымых праблемаў. Дэмакратычная грамадзкасьць бачыць у будаўніцтве АЭС і палітычны аспэкт. Атамная электрастанцыя, на думку удзельнікаў пікету, закліканая ўмацаваць пажыцьцёвае кіраваньне Аляксандра Лукашэнкі. "У адносінах з часткай сьвету ён можа выкарыстаць ядзерную дубіну", - гаворыць кіраўнік Віцебскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Кастусь Смолікаў. На ягоную думку, пытаньне пра будаўніцтва АЭС павінна быць прадметам шырокага грамадзкага абмеркаваньня. Прычым К. Смолікаў не выключае, што было б карысна на рэфэрэндуме спытацца ў народа пра ягоныя адносіны да ідэі пабудовы атамнай электрастацыі.

Акцыя доўжылася амаль гадзіну. Пікетчыкі распаўсюдзілі 2000 улётак супраць АЭС і 400 паасобнікаў "Новой газеты" з матэрыяламі пра вынікі апошняга рэфэрэндуму.

Яраслаў Блінаў

ГОМЕЛЬ

Грамадзкага актывіста вымусілі звольніцца

Старшыня Гомельскай філіі Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Прававая ініцыятыва" Леанід Судаленка пад ціскам напісаў заяву аб звальненьні з працы па ўласным жаданьні.

Л. Судаленка больш за пяць гадоў працаваў юрысконсультам у фірме цырульніцкіх паслугаў ААТ *"Локон"* і ніводнага разу не прайграваў справы, якія распачыналі супрацоўнікі фірмы. Але бездакорная прафэсійная рэпутацыя стала ахвярай грамадзкай дзейнасьці Судаленкі. "Маё становішча на працы зьмянілася пасьля маёй спробы стаць дэпутатам парлямэнту. Дырэктарку прадпрыемства неаднаразова выклікалі да начальства і патрабавалі майго звальненьня. Ніякія довады на маю карысьць ня дзейнічалі. І, як я разумею, яе ў выніку паставілі перад выбарам: альбо я, альбо яна", - камэнтуе падзею Леанід Судаленка.

Ён паведаміў, што ня стаў ўскладняць сваё становішча і пагадзіўся напісаць заяву аб звальненьні па ўласным жаданьні. "Але я зрабіў гэта пад ціскам", - заявіў сп. Судаленка.

ГОРАДНЯ

Ратуюць Каложу

У Горадні вядуцца землеўмацавальныя працы на беразе ракі Нёман, каля старажытнай Каложскай царквы. Ужо некалькі гадоў грамадзкасьць спрабуе прыцягнуць увагу ўладаў да праблемы захаваньня гэтага помніка беларускага дойлідзтва другой паловы XII ст. Сёлета нарэшце распачаліся працы з мэтай прадухіленьня спаўзаньня ў Нёман і разбурэньня славутай Каложы.

А.Б.

Рэгістрацыя сымболікі

Прапануем увазе чытачоў "Асамблеі" чарговы артыкул Вольгі Смалянкі, прысьвечаны пытаньням рэгістрацыі сымболікі грамадзкіх аб'яднаньняў Беларусі.

Вольга Смалянка,
юрыст

Да моманту ліквідацыі грамадзкага аб'яднаньня "Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў" зьяўлялася сябрам яго праўленьня.

Друкуецца паводле: электронная рассылка, islr@infonet.by.

АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ

У адпаведнасьці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусі любое грамадзкае аб'яднаньне мае права мець сымболіку, зарэгістраваную ўва ўсталяваным парадку.

Выдзяляюць наступныя віды сымболікі:

- эмблема;
- сьцяг;
- гальштук;
- вымпел;
- значак;
- гімн.

Сымболіка аб'яднаньняў падлягае:

- дзяржаўнай рэгістрацыі па такіх відах, як гімн, значак, вымпел, гальштук, адначасова зь дзяржаўнай рэгістрацыяй аб'яднаньняў ці асобна ад яе ў парадку, прадугледжаным для дзяржаўнай рэгістрацыі аб'яднаньня;
- дзяржаўнай рэгістрацыі па такіх відах, як сьцяг і эмблема, у адпаведнасьці з заканадаўствам аб дзяржаўнай рэгістрацыі афіцыйных геральдычных сымбаляў.

Такім чынам, гальштукі, вымпелы, значкі, гімны рэспубліканскіх і міжнародных грамадзкіх аб'яднаньняў рэгіструюцца ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусі, мясцовых - ува Ўпраўленьнях юстыцыі абл- (Менгар-)-выканкамаў з абавязковым атрыманьнем заключэньня Камітэту па архівах і справаводзтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі. Эмблемы і сьцягі грамадзкіх аб'яднаньняў рэгіструюцца Камітэтам па архівах і справаводзтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі з атрыманьнем экспэртнага заключэньня Геральдычнай рады пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі.

ПАТРАБАВАНЬНІ ДА СЫМБОЛІКІ ГРАМАДЗКАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ

Закон Рэспублікі Беларусі "Аб грамадзкіх аб"яднаньнях" усталёўвае агульныя патрабаваньні, якім павінна адпавядаць сымболіка ГА.

Сымболіка грамадзкага аб'яднаньня павінна адрозьнівацца ад сымболікі іншых грамадзкіх аб'яднаньняў, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусі, і не парушаць правоў на інтэлектуальную ўласнасьць. Не дазваляецца выкарыстаньне дзяржаўнай сымболікі, сымболікі іншай дзяржавы, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Сымболіка ГА ня можа служыць прапагандзе зьвяржэньня ці гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу, парушэньня цэласнасьці і бясьпекі дзяржавы, прапагандзе вайны, гвалту, распальваньня нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасьці.

Сымболіка грамадзкага аб'яднаньня павінна адрозьнівацца ад сымболікі ГА, ліквідаваных паводле рашэньня суду.

ПАРАДАК РЭГІСТРАЦЫІ ЭМБЛЕМЫ І СЬЦЯГА

Пад афіцыйнымі геральдычнымі сымбалямі разумеюць, сярод іншага, сьцягі, эмблемы, нагрудныя і апазнавальныя знакі[1] палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў, іншых грамадзкіх аб'яднаньняў.

Такім чынам, эмблемы і сьцягі аб'яднаньняў падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасьці з заканадаўствам пра дзяржаўную рэгістрацыю афіцыйных геральдычных сымбаляў.

Эмблемы і сьцягі грамадзкіх аб'яднаньняў зацьвярджаюцца толькі пасьля атрыманьня станоўчага экспэртнага заключэньня Геральдычнай рады пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі.

Парадак прыёму і разгляду ў органах Дзяржаўнай архіўнай службы Рэспублікі Беларусі дакумэнтаў пра ўсталяваньне афіцыйнай сымболікі палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў і іншых ГА, выдачы заключэньняў і ўнясеньня сымболікі ў Дзяржаўны геральдычны рэестар Рэспублікі Беларусі вызначаны палажэньнем аб парадку прыёму, разгляду дакумэнтаў, выдачы заключэньняў і рэгістрацыі сымболікі палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў і іншых грамадзкіх аб'яднаньняў, зацьверджанага 10.12.2002 г. Пастановай № 48 Камітэту па архівах і справаводзтве

Грамадзкія аб'яднаньні міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўняў, якія жадаюць усталяваць сымболіку, падаюць у Камітэт па архівах і справаводзтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі (далей - Белкамархіў) заяву аб правядзеньні ў Геральдычнай радзе пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі афіцыйнай геральдычнай экспэртызы сымболікі, якую яны хочуць усталяваць, да якой на кожны яе від у 4 асобніках прыкладаюцца:

- копія пасьведчаньня пра рэгістрацыю грамадзкага аб'яднаньня;
- праект палажэньня пра сымболіку[2];
- каляровая выява сымболікі;
- выява сымболікі зь перадачай колераў умоўнай шафіроўкай[3];
- візуальнае і сэмантычнае апісаньне сымболікі;

- абгрунтаваньне неабходнасьці ўсталяваньня сымболікі[4].

Грамадзкія аб'яднаньні абласнога, раённага і гарадзкога ўзроўняў падаюць заяву[5] ў органы кіраваньня архіўнай справай у абласьцях і горадзе Менску, якія выдаюць заключэньне пра адпаведнасьць ці неадпаведнасьць эскізаў сымболікі ўсталяваным патрабаваньням па кожным яе відзе і затым накіроўваюць дакумэнты ў Белкамархіў.

Рэкамэндуем у выпадку рэгістрацыі каляровай вэрсіі эмблемы рэгістраваць і чорна-белую вэрсію, бо органы рэгістрацыі патрабуюць выкарыстаньня эмблемы толькі ў зарэгістраваным варыянце.

У выпадку падачы няпоўнага камплекту дакумэнтаў ці выкананьня эскізаў сымболікі, якія не адпавядаюць усталяваным патрабаваньням, Белкамархіў ці орган кіраваньня архіўнай справай у абласьцях і горадзе Менску накіроўвае ліст зацікаўленай арганізацыі з выкладзенымі заўвагамі. Новая дапрацаваная сымболіка падлягае паўторнаму разгляду ў агульным парадку.

Дакумэнты па сымболіцы з прыкладаньнем заключэньняў па кожным яе відзе накіроўваюцца Белкамархівам у Геральдычную раду ў сямідзённы тэрмін.

Экспэртыза афіцыйнага геральдычнага сымбалю ажыцьцяўляецца Геральдычнай радай на працягу двух месяцаў.

Паводле вынікаў праведзенай экспэртызы Геральдычная рада прымае адно з наступных рашэньняў:

- пра магчымасьць усталяваньня эмблемы;
- пра неабходнасьць дапрацоўкі эмблемы;
- пра немэтазгоднасьць усталяваньня эмблемы.

Падставай для вынясеньня Геральдычнай радай адмоўнага экспэртнага заключэньня па афіцыйным геральдычным сымбалі можа быць:

- неадпаведнасьць пададзеных матэрыялаў патрабаваньням заканадаўства;
- тоеснасьць афіцыйнага геральдычнага сымбалю іншаму сымбалю, раней унесенаму ў Дзяржаўны геральдычны рэестар Рэспублікі Беларусі (далей - Геральдычны рэестар), ці зарэгістраванаму ўва ўсталяваным парадку гандлёваму знаку;
- выкарыстаньне ў якасьці афіцыйнага геральдычнага сымбалю элемэнту, які ўвайшоў у агульнае карыстаньне зь іншым сэнсам;
- парушэньне правоў геральдыкі, неадпаведнасьць існым гістарычным традыцыям.

photo.bymedia.net

Экспэртнае заключэньне Геральдычнай рады можа быць абскарджанае ў судзе.

Пасьля разгляду сымболікі на Геральдычнай радзе і атрыманьня на яе станоўчага рашэньня сымболіка ўносіцца Белкамархівам у Геральдычны рэестар.

У выпадку прыняцьця рашэньня пра неабходнасьць дапрацоўкі ці немэтазгоднасьць усталяваньня сымболікі Геральдычная рада абгрунтоўвае сваё рашэньне. Белкамархіў накіроўвае ліст зацікаўленай арганізацыі разам з рашэньнем Геральдычнай рады і пры неабходнасьці дапрацоўкі прапаноўвае падаць дакумэнты паўторна.

Белкамархіў выдае ці высылае праз пошту прадстаўніку арганізацыі, якая ўсталёўвае сымбаль, пасьведчаньне пра дзяржаўную рэгістрацыю сымболікі і ўнясеньне яе ў Геральдычны рэестар.

Патрабаваньні да эскізаў сымболікі грамадзкіх аб'яднаньняў

Эскізы сымболікі павінны быць вытрыманыя ў строгай канфігурацыі, якая адпавядае канкрэтнаму яе віду. Кожны асобнік эскізу разьмяшчаецца на асобным аркушы фармату А4. Памеры эскізаў павінны быць 10х10 см. У выпадку калі эскіз выкананы ў выглядзе акружнасьці, то дыямэтар апошняй павінен складаць 10 см; калі эскіз уяўляе сабой выцягнутую фігуру, то 10 см павінен складаць самы доўгі яе бок. Эскізы павінны быць афарбаваныя ў дакладна вызначаныя колеры. Нельга выкарыстоўваць у эскізах паўтоны. Усе элемэнты ў эскізах павінны ўяўляюць сабой стылізаваныя выявы. Выява натуральных элемэнтаў недапушчальная. Эскізы ў цэлым і іх элемэнты павінны прынцыпова адрозьнівацца як ад ужо зарэгістраванай ці ўзгодненай сымболікі, так і ад зьнятай з рэгістрацыі на цяперашні момант. Выкарыстаньне ў эскізах выяваў дзяржаўнай сымболікі Рэспублікі Беларусі і іншых краінаў сьвету недапушчальнае. Выкарыстаньне ў эскізах словаў "Рэспубліка Беларусь", "Беларусь", "нацыянальны", "Народны", "акадэмія", "інстытут", "цэнтар" у любым склоне, а "нацыянальны" і "народны" - у любым родзе не дазваляецца. Не дазваляецца таксама выкарыстоўваць афіцыйна зацьверджаную выяву Чырвонага Крыжа.

Эскізы ў цэлым і іх элемэнты павінны ў поўнай меры адпавядаць сутнасьці і ідэям, якія закладзеныя ўва ўстаноўчых дакумэнтах грамадзкага аб'яднаньня.

Эскізы павінны быць выкананыя на высокім мастацкім узроўні. Каляровыя, з умоўнай шафіроўкай і чорна-белыя вэрсіі эскізаў павінны быць цалкам, за выключэньнем каляровага афармленьня, ідэнтычнымі.

Патрабаваньні, якія выстаўляюцца да візуальных і сэмантычных апісаньняў сымболікі грамадзкіх аб'яднаньняў

Візуальнае апісаньне сымболікі павінна даваць поўнае ўяўленьне пра эскіз. Візуальнае апісаньне і эскіз павінны быць узаемазамяняльныя. Візуальнае апісаньне

паводле сваёй структуры павінна ўтрымліваць інфармацыю пра разьмяшчэньне і колеравае рашэньне элемэнтаў, якія ўваходзяць у эскіз, і не павінна перавышаць сямі радкоў тэкставай інфармацыі. Візуальнае апісаньне не рыхтуецца на эскізы з умоўнай шафіроўкай і чорна-белыя эскізы.

Сэмантычнае апісаньне сымболікі павінна раскрываць сэнс эскізу, разьмяшчэньне і колеравае рашэньне яго элемэнтаў, а таксама ўказваць матывы, якімі кіраваліся распрацоўнікі, выбіраючы той ці іншы сюжэт. Пры наяўнасьці ў эскізах надпісаў, зробленых на замежных мовах, у сэмантычным апісаньні ўказваецца пераклад гэтых надпісаў на беларускую і расейскую мовы. Надпісы на замежных мовах, якія ня ўтрымліваюць у сабе ўнівэрсальных міжнародных тэрмінаў ці зробленыя не на падставе кірылічнай ці лацінскай графікі, падлягаюць перакладу з абавязковым узгадненьнем яго ў Інстытуце мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Абрэвіятуры ў эскізах, незалежна ад мовы, падлягаюць расшыфроўцы. У выпадку, калі ў сэмантычным апісаньні прыводзіцца не агульнавядомая ці спрэчная інфармацыя, у тэксьце павінна быць прыведзеная дакладная спасылка на крыніцу інфармацыі. Сэматычнае апісаньне не патрабуецца ў тых выпадках, калі эскіз ці яго элемэнты самі раскрываюць сутнасьць, прынцыпы і ідэі грамадзкага аб'яднаньня.

У *палажэньні пра эмблему аб'яднаньня* ўказваюцца: 1) агульная характарыстыка эмблемы; 2) мэты ўстановы; 3) поўнае візуальнае апісаньне эмблемы; 4) сэмантычнае апісаньне эмблемы; 5) выкарыстаньне эмблемы.

У *абгрунтаваньні неабходнасьці ўсталяваньня эмблемы* аб'яднаньне, якое ўсталёўвае эмблему, указвае: 1) нарматыўныя прававыя акты, у адпаведнасьці зь якімі ўсталёўваецца эмблема; 2) прычына ўсталяваньня эмблемы.

ПАРАДАК РЭГІСТРАЦЫІ ГАЛЬШТУКАЎ, ВЫМПЕЛАЎ, ЗНАЧКАЎ, ГІМНАЎ

Гальштукі, вымпелы, значкі, гімны грамадзкага аб'яднаньня, у выпадку іх наяўнасьці, падлягаюць абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі, якая можа зьдзяйсьняцца як адначасова зь дзяржаўнай рэгістрацыяй грамадзкага аб'яднаньня, так і асобна ад яе ў парадку, прадугледжаным для дзяржаўнай рэгістрацыі ГА. Пры рэгістрацыі сымболікі адначасова з рэгістрацыяй ГА збор за рэгістрацыю сымболікі не зьбіраецца. Пры рэгістрацыі сымболікі асобна ад рэгістрацыі грамадзкага аб'яднаньня збор за рэгістрацыю сымболікі складае 50% збору за рэгістрацыю ГА (дзіцячыя і моладзевыя мясцовыя і рэспубліканскія грамадзкія аб'яднаньні вызваленыя ад уплаты рэгістрацыйнага збору).

Неабходна памятаць, што за дзяржаўную рэгістрацыю ГА спаганяецца рэгістрацыйны збор у памеры:

- для мясцовых грамадзкіх аб'яднаньняў - 10 базавых велічынь;
- для рэспубліканскіх і міжнародных грамадзкіх аб'яднаньняў – 25 базавых велічынь. Для міжнародных ГА 50% рэгістрацыйнага збору спаганяецца ў свабодна канвэртоўнай валюце.

Для таго каб зарэгістраваць сымболіку, ГА першапачаткова павінна атрымаць заключэньне Камітэту па архівах і справаводзтве. Для гэтага рэспубліканскія і міжнародныя ГА падаюць у Белкамархіў, а мясцовыя ГА - у органы кіраваньня архіўнай справай у абласьцях і горадзе Менску наступныя дакумэнты:

1. Заяву з просьбай даць заключэньне на сымболіку аб'яднаньня, якая падаецца на блянку арганізацыі. У адной заяве можа ўтрымлівацца просьба даць заключэньне на некалькі відаў сымболікі.

2. Каляровую вэрсію сымболікі - 4 асобнікі памерам 10х10 см, якія павінны быць выкананыя на аркушах фармату А4. Рэкамэндуецца пазьбягаць дробных дэталяў і выкарыстоўваць максімум 3 колеры. Шэры, ружовы колеры не выкарыстоўваюцца.

3. Графічную выяву сымболікі (выяву сымболікі зь перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай) - 4 асобнікі памерам 10х10 см, якія выконваюцца на аркушах фармату А4.

4. Візуальнае і сэмантычнае апісаньне сымболікі (4 асобнікі), якое можа быць выкладзена на беларускай альбо расейскай мовах.

Для рэгістрацыі сымболікі ў орган рэгістрацыі падаюцца наступныя дакумэнты:

1. Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі сымболікі (калі сымболіка рэгіструецца адначасова з грамадзкім аб'яднаньнем, дык падаецца адна заява, у якой выкладаецца просьба зарэгістраваць ГА і яго сымболіку).

2. Дакумэнт банку, які пацьвярджае аплату рэгістрацыйнага збору - у выпадку, калі рэгістрацыя праводзіцца не адначасова з рэгістрацыяй грамадзкага аб'яднаньня (яшчэ раз адзначым, што дзіцячыя і моладзевыя рэспубліканскія і мясцовыя ГА рэгістрацыйнага збору не аплачваюць).

3. Падрабязнае апісаньне сымболікі з дадаткам заключэньня Камітэту па архівах і справаводзтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі па кожным яе відзе і выявы гэтай сымболікі ў чатырох асобніках памерам 10х10 см.

4. Адпаведнае рашэньне (пратакол) упаўнаважаных згодна статуту органаў аб зацьвярджэньні сымболікі.

ЗАЎВАГІ І КАМЭНТАРЫ

[1] У дадзеным матэрыяле ня будзе разглядацца пытаньне рэгістрацыі нагрудных і апазнавальных знакаў грамадзкіх аб'яднаньняў.

[2] Гл. Дадатак № 1.

[3] Гл. Дадатак № 2.

4 Шафіроўка – гэта выява з умоўнай перадачай колераў (выкарыстоўваецца міжнародны графічны код): чорны колер – сетка; белы, срэбраны колеры – белы колер; чырвоны колер – дробная вэртыкальная штрыхоўка; сіні, блакітны колеры – дробная гарызантальная штрыхоўка;

зялёны колер – штрыхоўка пад углом у 45 градусаў (зьлева направа); пурпурны, фіялетавы колеры – штрыхоўка пад вуглом 45 градусаў (справа налева); жоўты колер – кропкі. Штрыхоўка павінна быць як мага драбнейшай.

5 Гл. Дадатак № 3.

ДАДАТАК № 1

Форма заявы аб правядзеньні афіцыйнай геральдычнай экспэртызы сымболікі

Старшыні Камітэту па архівах і справаводзтве
пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі

_____
(поўная назва і юрыдычны

_____
адрас грамадзкага аб'яднаньня)

ЗАЯВА

Просім разгледзець паданыя намі дакумэнты на прадмет адпаведнасьці

_____
(від сымболікі)

установленым патрабаваньням і накіраваць у Геральдычную раду пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі.

Дадатак:

- 4 асобнікі каляровых эскізаў _____;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі эскізаў _____ зь перадачай колераў умоўнай шафіроўкай;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі візуальнага і сэмантычнага апісаньняў эскізаў _____;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі праекту палажэньня;

- 4 асобнікі абгрунтаваньня неабходнасьці ўсталяваньня _____;
(від сымболікі)

- копія пасьведчаньня аб рэгістрацыі.

_____
(кіраўнік)

_____ _____
(Імя, імя па бацьку, прозьвішча) *(подпіс)*

_____ **М.п.**
(дата)

ДАДАТАК № 2

Узор Палажэньня аб эмблеме Грамадзкага аб'яднаньня

Палажэньне аб эмблеме Грамадзкага аб'яднаньня
"_____"

1. Агульнае апісаньне эмблемы

Уяўляе сабой *апісаньне выгляду.*

2. Мэты ўсталяваньня эмблемы

Сымболіка зьяўляецца адметным знакам аб'яднаньня і будзе выкарыстоўвацца на блянку, буклетах.

3. Поўнае візуальнае апісаньне эмблемы

Эмблема Грамадзкага аб'яднаньня "_____" уяўляе сабой *дэтальнае апісаньне выгляду*. **Эмблема выкананая з выкарыстаньнем** *N* **колераў -** *пералік колераў*. **Эмблема выкарыстоўваецца таксама ў чорна-белым варыянце.**

4. Сэмантычнае апісаньне эмблемы

Што сымбалізуе эмблема, альбо яе часткі. **Эмблема выкананая з выкарыстаньнем** *N* **колераў -** *пералік колераў*. **Эмблема выкарыстоўваецца таксама ў чорна-белым варыянце.**

5. Выкарыстаньне эмблемы

Эмблема Грамадзкага аб'яднаньня "_____" будзе выкарыстоўвацца на блянку, буклетах.

Старшыня праўленьня
Грамадзкага аб'яднаньня
"_____" _____

ДАДАТАК № 3

Форма абгрунтаваньня неаб'ходнасьці ўсталяваньня сымболікі

АБГРУНТАВАНЬНЕ
Неабходнасьці ўсталяваньня

_____
(від сымболікі)

_____
(назва арганізацыі)

1. Нарматыўныя прававыя акты, у адпаведнасьці зь якімі ўсталёўваюцца сымболіка:

- Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 7 жніўня 2002 г. № 441 "Аб утварэньні Геральдычнай рады пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі і некаторых захадах па ўдасканаленьні парадку заснаваньня і дзяржаўнай рэгістрацыі ордэнаў, мэдалёў і афіцыйных геральдычных сымбаляў" (Нацыянальны рэестар прававых актаў Рэспублікі Беларусі. 2002. № 91. 1/3951);

- Закон Рэспублікі Беларусі ад 5 кастрычніка 1994 г. "Аб палітычных партыях" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 30. С. 509);

- Закон Рэспублікі Беларусі ад 4 кастрычніка 1994 г. "Аб грамадзкіх аб"яднаньнях" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 1994. № 29. С. 503);

- Закон Рэспублікі Беларусі ад 22 красавіка 1992 г. "Аб прафэсійных саюзах" (Нацыянальны рэестар прававых актаў Рэспублікі Беларусі. 2000. № 23. 2/146).

2. Прычына ўсталяваньня сымболікі.

ДАДАТАК № 4

Форма заявы ў органы кіраваньня архіўнай справай у абласьцях і горадзе Менску

У _____ вобласьці (г. Менску)
(орган кіраваньня архіўнай справай)

_____
(поўная назва і юрыдычны адрас

_____
палітычнай партыі, прафэсійнага саюзу,

_____
іншага грамадзкага аб'яднаньня)

ЗАЯВА

Просім выдаць заключэньне на адпаведнасьць _____ устаноўленым патрабаваньням
(від сымболікі)

і накіраваць дакумэнты ў Камітэт па архівах і справаводзтве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі для падачы іх у Геральдычную раду пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі.

Дадаткі:

- 4 асобнікі каляровых эскізаў _____;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі эскізаў _____ зь перадачай колераў умоўнай шафіроўкай;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі візуальнага і сэмантычнага апісаньняў эскізаў _____;
(від сымболікі)

- 4 асобнікі праекту палажэньня;

- 4 асобнікі абгрунтаваньня неабходнасьці ўсталяваньня _____;
(від сымболікі)

- копія пасьведчаньня аб рэгістрацыі.

_____ _____
(кіраўнік) *(подпіс)*

_____
(Імя, імя па бацьку, прозьвішча) **М.п.**

_____
(дата)

У Беларусі адбудзецца суд над сталінізмам

Зь мінулага году ў нашай краіне праводзяцца грамадзкія слуханьні "Злачынствы сталінізму ў Беларусі". У іх бяруць удзел грамадзкія актывісты, навукоўцы, былыя палітвязьні. Чакаецца, што ўвосень паводле вынікаў слуханьняў будзе вынесены грамадзкі і юрыдычны вэрдыкт па злачынствах сталінізму на тэрыторыі Беларусі.

Арцём Лява

Яшчэ ў пачатку 1990-х гг., адразу па развале Савецкага Саюзу, гучалі прапановы аб правядзеньні новага "Нюрнбэргскага працэсу", на гэты раз над камунізмам. Але, з розных прычынаў, такога суду - праўда, грамадзкага - давялося чакаць доўга. Толькі ў 2000 г. у Вільні быў праведзены міжнародны трыбунал, на якім разглядаліся злачынствы камунізму. Беларусь на ім прадстаўляла група асобаў у складзе Радзіма Гарэцкага, Зянона Пазьняка, Маі Кляшторнай, Ігара Кузьняцова. Беларускі Хельсынскі камітэт павінен быў падрыхтаваць абвінаваўчае заключэньне ад Беларусі, але зь невядомых прычынаў яно не было зроблена. Таму ў агульным абвінаваўчым заключэньні трыбуналу Беларусь не фігуравала. Удзел беларусаў абмежаваўся выступленьнямі падчас дыскусіяў...

У лістападзе мінулага году беларускія сябры міжнароднага "Мэмарыялу", грамадзкая ініцыятыва "За выратаваньне мэмарыялу Курапаты" і дзьве існыя асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсіяў прынялі рашэньне пачаць правядзеньне грамадзкіх слуханьняў злачынстваў сталінізму на тэрыторыі Беларусі ў 1920–1950-я гг. Першае слуханьне, прысьвечанае праблеме рэпрэсіяў супраць сялянства, адбылося ў сьнежні 2004 г. З прычыны няяўкі двух асноўных дакладчыкаў з дакладам выступіў адзін з арганізатараў слуханьняў, гісторык Ігар Кузьняцоў. Былі заслуханыя прадстаўнікі асацыяцыяў ахвяр палітычных рэпрэсіяў, пераважна дзяцей рэпрэсаваных, якія знаходзіліся ў высылцы. Гэтыя ўспаміны былі пададзены ў якасьці абвінавачаньняў рэжыму, які пазбавіў людзей дзяцінства, а іх бацькоў - маёмасьці. Да гэтага часу яны адчуваюць на сабе таўро ворагаў народу. У Беларусі ліквідаваныя льготы для рэпрэсаваных, хаця ў іншых краінах СНД яны захаваліся. У выніку першых слуханьняў іх удзельнікі прыйшлі да высновы, што ў сталінскія часы было зьдзейсьнена злачынства супраць беларускага сялянства. У выніку цэлага комплексу захадаў савецкіх уладаў яно фактычна ліквідоўвалася як кляса.

Другое паседжаньне адбылося ў студзені гэтага году і было прысьвечана праблеме рэпрэсіяў супраць нацыянальных меншыняў. Наагул да кастрычніка павінна адбыцца каля 5 паседжаньняў, на якіх між іншых будуць разглядацца тэмы рэпрэсіяў паводле рэлігійнай прыкметы, рэпрэсіі часоў вайны супраць ваеннапалонных, людзей, што знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі ці ў эвакуацыі, пасьляваенныя рэпрэсіі, у тым ліку і супраць дысыдэнтаў. Асобна будуцьразглядацца праблемы ўшанаваньня памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў, рэабілітацыі, аднаўленьня льготаў для рэпрэсаваных. Заключнае паседжаньне адбудзецца напярэдадні 30 кастрычніка - Дня памяці ахвяраў палітычных рэпрэсіяў. Плянуецца, што на ім будзе вынесена заключэньне, аналягічнае таму, што было зробленае на міжнародным трыбунале ў Вільні. Удзельнікі слуханьняў вынясуць грамадзкі і юрыдычны вэрдыкт па злачынствах сталінізму на Беларусі.

- На які эфэкт ад гэтых слуханьняў вы спадзеяцеся? - запытаўся я ў гісторыка, сябра міжнароднага "Мэмарыялу" **Ігара Кузьняцова.**

- На вялікі эфэкт мы не разьлічваем, - гаворыць сп. Кузьняцоў. - Але важны ўжо той факт, што грамадзкія слуханьні "Злачынствы сталінізму ў Беларусі" праводзяцца ў краіне, якая ўнесеная ў сьпіс шасьці дыктатарскіх рэжымаў сьвету. Няхай гэты працэс абмежаваны, лякальны, але ён ідзе, і мы знойдзем сродкі давесьці яго вынікі да грамадзтва і міжнароднай супольнасьці.

Арганізатары адзначаюць таксама, што правядзеньне слуханьняў актывізавала арганізацыі ахвяр палітычных рэпрэсіяў. Пачаў накопліваццa каштоўны матэрыял пра сталінскія рэпрэсіі на Беларусі, які можа быць разьмешчаны на інтэрнэт-сайтах зацікаўленых арганізацыяў альбо нават выдадзены ў выглядзе асобнай брашуры. У яе ўвайшлі б і матэрыялы слу-

ГОРАДНЯ

Арганізацыі выкідаюць на вуліцу

Некалькі гарадзенскіх грамадзкіх арганізацыяў у бліжэйшы час могуць пазбавіцца памяшканьня, а разам зь ім і юрыдычных адрасоў.

Старшыня Гарадзенскага гарадзкога грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне" Мікола Воран атрымаў 10 студзеня ліст за подпісам дырэктара УЖРЭП Ленінскага раёну Горадні Анатоля Літвіна, у якім прапаноўвалася спыніць дамову арэнды памяшканьня па вул. К. Маркса, 11 "паводле дамоўленасьці бакоў". Пры гэтым быў устаноўлены тыднёвы тэрмін для вызваленьня памяшканьня. У памяшканьні яшчэ з 1990-х гг. месьцяцца і іншыя грамадзкія аб'яднаньні: гарадзенскае абласное грамадзкае аб'яднаньне БНФ "Адраджэньне", ленінская раённая гарадзкая арганізацыя БНФ "Адраджэньне" і клюб "Паходня". Знаходзіцца там і гарадзкі камітэт ПКБ. Усе яны мусяць пакінуць будынак праз тое, што ён нібыта знаходзіцца ў аварыйным стане. Гэта сьцьвярджае АУП "Інстытут "Горадняграмадзянпраект", заключэньне якога, аднак, А. Літвін адмовіўся прадэманстраваць грамадзкім актывістам. Апошнім давялося ў пісьмовым звароце патрабаваць азнаямленьня з дакумэнтам, на падставе якога грамадзкім арганізацыям пагражае высяленьне, а таксама даваньня альтэрнатыўных памяшканьняў для разьмяшчэньня офісаў.

Паводле закону "Аб зваротах грамадзянаў" адміністрацыя УЖРЭП павінна будзе ў месячны тэрмін даць адказ. "Магчыма, такім чынам нам удасца дазнацца пра рэальныя прычыны такога тэрміновага высяленьня офісаў няўрадавых арганізацыяў з будынку, які мы займаем ня першы год, – кажа М. Воран. – Але гэтыя захады ўладаў можна патлумачыць толькі неабходнасьцю зачысьціць палітычнае поле напярэдадані прэзыдэнцкіх выбараў, якія могуць адбыцца ўжо ўвосень. Улада баіцца грамадзкай актыўнасьці".

Напрыканцы студзеня УЖРЭП Ленінскага раёну вырашыў высяліць грамадзкія аб'яднаньні з будынку па вул. К. Маркса, 11 праз Гаспадарчы суд вобласьці. А. Літвін просіць суд скасаваць дамову з грамадзкімі аб'яднаньнямі і высяліць іх з будынку. Характэрна, што прыватная будаўнічая крама, якая знаходзіцца там жа, працуе безь перашкодаў. Гэта толькі ўмацоўвае перакананьне грамадзкіх актывістаў у тым, што прычынай іх праблемаў зьяўляецца палітыка. Улады спрабуюць пазбавіць юрыдычных адрасоў "нядобранадзейныя" НДА, ведаючы, што знайсьці новыя адрасы амаль немагчыма.

Напрыканцы лютага суд прыняў рашэньне пра высяленьне Ленінскай раённай і абласной Радаў БНФ "Адраджэньне". Раней такое рашэньне было вынесенае ў дачыненьні арганізацыяў ПКБ.

Антон Лабовіч, Сяргей Клімовіч

ВІЦЕБСК

Зачыняюцца грамадзкія клюбы

Віцебскія грамадзкія аб'яднаньні, якія працавалі пры жыльлёва-камунальных службах, у пачатку студзеня былі пазбаўленыя памяшканьняў.

Грамадзкім актывістам было заяўлена, што клюбы па месцы жыхарства зачыненыя праз тое, што яны не спраўляюцца з сваімі задачамі і патрабуюць вялікіх выдаткаў. Арганізацыі, якія займаюцца дзецьмі, альбо зачынілі, альбо перадалі аддзелам адукацыі. Напрыклад, з такога клюбу, разьмешчанага па вул. Газэты "Праўда" (д. 63, корп. 6) у памяшканьнях, што належаць Кастрычніцкаму ЖРЭТ, былі выкінутыя краязнаўчае аб'яднаньне "Спадкаемцы", некалькі мастацкіх гурткоў, лялечны тэатар, арганізацыя калекцыянэраў, група псыхалягічнай дапамогі, клюб сямейнага выхаваньня, спартыўная сэкцыя.

"Для маіх падапечных гэта вельмі "выхаваўча". Яны атрымалі своеасаблівы палітычны ўрок. Дзеці цяпер ня будуць чакаць падачак ад дзяржавы", – так камэнтуе рашэньне ўладаў **Людміла Беліцкая**, кіраўніца вучнёўскага краязнаўчага клюбу "Спадкаемцы". Адначасова ёй вельмі шкада дарослых, асабліва людзей старэйшага пакаленьня: "Калі дзіцячыя клюбы, сэкцыі ці гурткі разьмяркоўваюць па ўстановах адукацыі ці пад крыло піянерскіх арганізацыяў, то што зрабілі з аб'яднаньнямі, куды прыходзілі бабулькі? Іх проста выкінулі на вуліцу!"

Л. Беліцкая спрабавала дамагчыся справядлівасьці, апэлюючы да найвышэйшых уладаў: "Праз прэзыдэнцкі сайт я зьвярталася да А. Лукашэнкі з просьбай высьветліць сытуацыю, назваць віноўнікаў: народ павінен ведаць сваіх "герояў". Адказу не было".

Вітальд Гамбровіч

ханьняў, і абвінаваўчае заключэньне. Адна праблема - поўная адсутнасьць фінансаваньня, усё робіцца толькі на грамадзкіх пачатках.

Лягічным завяршэньнем гэтай грамадзкай ініцыятывы будзе ўсталяваньне 30 кастрычніка 2005 году ў Курапатах часовага помніка ахвярам палітычных рэпрэсіяў. Справа ў тым, што калісьці там зьявіўся камень з шыльдай, якая інфармавала пра рашэньне Савету Міністраў Беларусі ад 1989 г. усталяваць у Курапатах помнік. Помнік так і не зьявіўся, шыльда зьнікла, і міліцыя яе не шукае, а камень застаўся вольны. На ім грамадзкія актывісты і мяркуюць усталяваць новую шыльду. Зьмест надпісу, які будзе на ёй, пакуль невядомы - ён зьявіцца пасьля падвядзеньня вынікаў адмысловага конкурсу. Затое зь вялікай доляй імавернасьці можна дапусьціць, што часовы помнік ператворыцца ў пастаянны. Гэта будзе сымбаль па ўсіх ахвярах палітычных рэпрэсіяў у Беларусі.

Вінцэсь Дземянчук

Міхась Варанец выйграў суд супраць БТ

Суд Першамайскага раёну сталіцы прызнаў, што Белтэлерадыёкампанія і журналіст Мікалай Мельячэнка ў сакавіку 2004 г. у праграме "Панарама" распаўсюдзілі непраўдзівую інфармацыю пра дзейнасць ГА "Воля да развіцьця" і яго старшыні Міхася Варанца.

"Асамблея" неаднаразова паведамляла пра разьвіцьцё падзеяў вакол "Волі да развіцьця". Рэпрэсіўная машына, якая спадзявалася лёгка расправіцца з рэгіянальным ГА, нечакана паламала свае іклы, натрапіўшы на граматную і добра арганізаваную абарону. Спачатку М. Варанец дамогся, каб быў пакараны лейтэнант фінансавай міліцыі Юрчак, пасьля выйграў Гаспадарчы суд і вось, нарэшце, атрымаў чарговую перамогу. У адпаведнасьці з абвешчаным рашэньнем суда па справе аб абароне дзелавой рэпутацыі грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця" і гонару і годнасьці ягонага кіраўніка Міхася Варанца, Белдзяржтэлерадыёкампанія абавязаная на працягу дзесяці дзён агучыць у праграме "Панарама" рэзалютыўную частку судовага рашэньня. У прыватнасьці, падлягае абвяржэньню сьцьвярджэньне: *"По некоторым данным, кроме подросткового клуба господин Воронец создал так называемый ресурсный центр, целью которого является финансирование оппозиционных структур. Да видно так увлёкся этой деятельностью, что подростковый клуб ушел на вторые роли"*. Таксама будзе абвергнутае наступнае паклёпніцкае выказваньне журналіста на адрас "Волі да разьвіцьця" і Міхаіла Варанца: *"Если иностранные фонды не поддержат финансово горе-предпринимателя, его сомнительная деятельность на этом прекратится"*. У судовым пасяджэньні адказчыкі не прывялі аніякіх пацьверджаньняў гэтых выказваньняў, прызнаўшы, што гэта былі толькі іхнія меркаваньні, не падмацаваныя фактамі.



"Мы атрымалі важны станоўчы вынік, - кажа Міхась Варанец. - Трэба, каб людзі, якія абслугоўваюць рэжым, пры гэтым груба парушаюць закон, не адчувалі сябе беспакаранымі за зьдзейсьненыя ўчынкі. Іх прозьвішчы павінны быць вядомыя, яны мусяць несьці маральную адказнасьць за зробленае. Мы адмыслова не палітызавалі справу, не рабілі акцэнт, што быў палітычны заказ у адносінах да нашага аб'яднаньня, а скурпулёзна падыйшлі да яе з юрыдычнага пункту гледжаньня: сюжэт быў, ён не адпавядае сапраўднасьці і ён мусіць быць абвергнуты. Хаця ўсе мы разумеем, што палітыка тут прысутнічае, што ў краіне створаныя ўсе ўмовы для свавольства чыноўнікаў у дачыненьні да простых людзей. І вельмі нямногія рашаюцца дамагацца праўды і справядлівасьці, і ісьці да канца".

М. Варанец адзначыў падтрымку, якую ён атрымліваў ад Выканаўчага Бюро Асамблеі НДА і дапамогу праваабаронцы Юр'я Чавусава, які прадстаўляў у судзе інтарэсы ГА "Воля да развіцьця":

Алёна Андрэева, Сяргей Клімовіч

Антыядзерны фронт

Уцечка інфармацыі пра пляны рэжыму Лукашэнкі пабудаваць у Беларусі атамную электрастанцыю пакуль ня выклікала вялікага рэзанансу ў грамадзтве. Затое яшчэ адной грамадзкай ініцыятывай стала больш: Уладзімер Парфяновіч абвесьціў пра заснаваньне "Беларускага антыядзернага фронту".

Рашэньне пра стварэньне ў Беларусі ўласнай атамнай электрастанцыі нібыта было прынятае вышэйшым кіраўніцтвам краіны ў абстаноўцы сакрэтнасьці. Новы гіганцкі праект Лукашэнкі, які будзе каштаваць бюджэту як мінімум некалькі мільярдаў даляраў, мусіць ня толькі ліквідаваць энэргетычную залежнасьць Беларусі ад усходняга суседа, але і прынесьці беларускаму кіраўніку вялізныя палітычныя дывідэнды. "АЭС на тэрыторыі Беларусі – страхавы поліс А. Лукашэнкі супраць лёсу Мілошавіча і Садама, повад для пастаянных рэпрэсіяў супраць унутранай палітычнай апазыцыі з мэтай захаваньня славутай "бясьпекі", – піша ў сваёй заяве У. Парфяновіч. Ён абвесьціў пра арганізацыю "Беларускага антыядзернага фронту" ды заклікаў грамадзянаў ствараць групы супраціву ядзерным амбіцыям вышэйшага кіраўніцтва краіны. Неўзабаве пасьля гэтага Парфяновіча выклікалі ў рэспубліканскую пракуратуру "для дачы тлумачэньняў".

Дарэчы, АЭС плянуецца разьмясьціць на радзіме прэзыдэнта – на Магілёўшчыне. Беларускія навукоўцы ў сьнежні 2004 г. абвесьцілі пра існаваньне двух магчымых пляцовак: у раёне Быхава і Шклова – Горак.

Вінцэсь Дземянчук

Памёр Карлас Шэрман

У Нарвэгіі на 71-м годзе жыцьця памёр беларускі літаратар, ганаровы віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-Цэнтру Карлас Шэрман.

К. Шэрман нарадзіўся ў Уругваі. У Беларусі жыў з 1956 г. З 1989 да 2001 г. зьяўляўся віцэ-прэзыдэнтам Беларускага ПЭН-Цэнтру. Сьветлая памяць!

Піяр-кампанія Сьліжэўскага

Сапраўдную піяр-кампанію разгарнуў у пачатку лютага новы начальнік упраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алег Сьліжэўскі.

У буйных цэнтральных газэтах зьявіліся ягоныя інтэрвію, выступіў ён і па БТ, праўда, яго чамусьці назвалі як Алега Сьлепчанку (псэўданім?).

На старонках газэты "Рэспубліка" А. Сьліжэўскі паведаміў, што ў мінулым годзе былі ліквідаваныя 38 грамадзкіх аб'яднаньняў, а зарэгістраваныя 155 новых НДА. Прычынай нерэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў Сьліжэўскі назваў неахайную падрыхтоўку ўстаноўчых дакумэнтаў, іх супярэчлівасьць і г. д. Пра палітычныя матывы чыноўнік змаўчаў.

Андрэй Саванец

Птушка году

Барадатая кугакаўка названая ў Беларусі Птушкай году'2005.

ГА "Ахова птушак Беларусі" вызначае "птушку году" ўжо ў шосты раз. Сёлета была "намінаваная" барадатая кугакаўка, якую ў Беларусі можна сустрэць на тэрыторыі Берасьцейскай вобласьці.

Новыя ініцыятывы

Як грыбы пасьля дажджу зьяўляюцца ў апошнія месяцы самыя разнастайныя ініцыятывы нацыянальнага маштабу.

Генэрал Валеры Фралоў у Горадні абвесьціў пра стварэньне свайго руху пад назвай "Супраціў". Кіраўнік Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандар Ярашук заснаваў "Грамадзкі Вярхоўны Савет Беларусі". А праваабаронца Алег Воўчак гуртуе афіцэраў запасу ў рух "Абаронцы Айчыны". Зусім нядаўна паўстаў рух "Воля народу", каардынатарам якога зьяўляецца былы рэктар БДУ Аляксандар Казулін. Апошні адначасова заявіў пра свой намер балятавацца ў прэзыдэнты краіны і жаданьне ачоліць аб'яднаную сацыял-дэмакратычную партыю.

В. Д.

Гістарычны дакумэнт



У Менску адбылася прэзэнтацыя кнігі "Маніторынг парламенцкіх выбараў і рэспубліканскага ў Рэспубліцы Беларусь. 2004 год", падрыхтаванай Праваабарончым цэнтрам "Вясна" (рэдактар і адзін з аўтараў выданьня - Таця на Равяка, аўтары - Валянцін Стэфановіч, Уладзімер Лабковіч і Алесь Бяляцкі).

У "Маніторынгу..." сабраныя факты, зафіксаваныя назіральнікамі падчас усіх этапаў выбарчай кампаніі - ад абвяшчэньня выбараў і фармаваньня выбарчых камісіяў да падліку галасоў і агалошваньня вынікаў галасаваньня. Кнігу ўжо зараз называюць ня толькі юрыдычным, але і гістарычным дакумэнтам, які выкрывае злачынствы рэжыму.

"Мы канстатуем, што магчымасьць якіх-небудзь выбараў у Беларусі скончылася, - адзначыў у сваім уступным слове на прэзэнтацыі старшыня ПЦ "Вясна" Алесь Бяляцкі. - У краіне сфармаваная дасканалая сыстэма фальсіфікацыяў. Ад выбараў застаўся адно што - выбарчы антураж, які вельмі нагадвае выбары за савецкім часам. Справа ня толькі ў выбарчым заканадаўстве, але і ў сыстэме яго ўжываньня. Мы канстатуем, што ўлады не зьбіраліся і не зьбіраюцца праводзіць выбары "па правілах"... Грамадзянскую супольнасьць у Беларусі затрамбоўваюць у асфальт. Але ў нас сьмелыя і адважныя людзі, якія гатовыя рызыкаваць кар'ерай, працай, здароўем і нават уласнай свабодай дзеля дэмакратыі і незалежнасьці Беларусі. Без працы гэтых людзей наўрад ці зьявілася б гэтая кніга. Проста не было б чаго аналізаваць".

Ядвіга Мацкевіч

Ня ўсе беларусы сядзелі ў бульбе

Нонкамфармізм у Беларусі: 1953-1985. Даведнік. Т. 1. - Мн.: Athenaeum, 2004. - 252 с.

Гісторыя грамадзкай актыўнасьці ў часы савецкага панаваньня ў Беларусі дагэтуль застаецца маладасьледаванай старонкай. Зразумела, маюцца на ўвазе не афіцыйныя грамадзкія арганізацыі, якія абслугоўвалі ўладу, а незалежныя структуры, што паўставалі з ініцыятывы людзей і дзейнічалі нелегальна альбо паўлегальна. Пра іх не пісалі газэты, ня згадвалі тэлевізія і радыё (хіба толькі ў апошнія гады існаваньня СССР улады пачалі выкрываць у СМІ іх "шкодную дзейнасьць"). Таму цяпер, пішучы гісторыю беларускіх НДА 1970–1980-х гг., дасьледнікам даводзіцца абапірацца пераважна на ўспаміны іх удзельнікаў: архівы савецкіх спэцслужбаў, якія адсочвалі такую дзейнасьць, застаюцца закрытымі. Хаця ў апошнія гады пачала назірацца тэндэнцыя, калі ў Маскве выходзяць з друку даведнікі, зборнікі дакумэнтаў, у якіх зьмяшчаецца нямала інфармацыі пра супраціў у савецкай Беларусі. Гэта дае магчымасьць дасьледнікам ня толькі спраўдзіць вусныя сьведчаньні пра той ці іншы факт, падзею, але і значна іх дапоўніць.

Даведнік "Нонкамфармізм у Беларусі: 1953–1985" ужо ня першая спроба асьвятліць гэтую малавядомую старонку найноўшай гісторыі Беларусі. Яго папярэднікам быў даведнік "Дэмакратычная апазыцыя Беларусі: 1956–1991. Пэрсанажы і кантэкст", які выйшаў у Менску ў 1999 г. Нягледзячы на абмежаваную інфармацыю, ужо ў тым выданьні была дастаткова поўна асьветленая ўзьнятая праблема. У даведніку "Нонкамфармізм у Беларусі: 1953–1985" зробленыя дапаўненьні і ўдакладненьні, зьмешчаная грунтоўная прадмова, камэнтары. Асобны разьдзел прысьвечаны рэпрэсіўнаму заканадаўству БССР і РСФСР.

Кніга абвяргае колішнія ўяўленьні пра Беларусь савецкіх часоў як пра "камуністычны запаведнік", дзе не было ніякага супраціву саветызацыі, русіфікацыі. Насамрэч грамадзкая актыўнасьць у Беларусі не перапынялася нават у самых неспрыяльных умовах. Яна праяўлялася як асобнымі грамадзянамі, так і групамі людзей, у тым ліку добра арганізаванымі. У акрэсьлены пэрыяд пераважаў мірны супраціў (да сярэдзіны 1950-х гг. у БССР яшчэ існавала антысавецкае ўзброенае падпольле і невялікія партызанскія групы). Грамадзкая актыўнасьць людзей праяўлялася ў выробленьні асобнымі грамадзянамі альбо групамі ўлётак, плякатаў, надпісаў, у вядзеньні антысавецкай прапаганды, распаўсюдзе патрыятычных вершаў і г. д. Былі спробы наладзіць сыстэму распаўсюду самвыдату, які паступаў у Беларусь у асноўным з Расеі.

Кніга абвяргае колішнія ўяўленьні пра Беларусь савецкіх часоў як пра "камуністычны запаведнік"

Побач зь вядомымі фактамі ў даведніку ёсьць і раней невядомыя эпізоды супраціву. Напрыклад, у канцы 1950-х - пачатку 1960-х гг. на Берасьцейшчыне існавала падпольная арганізацыя "Беларуская рэвалюцыйная партыя", якая была выкрыта і ліквідавана КГБ. Вельмі падрабязна апісваецца гісторыя дзейнасьці групы Сяргея Ханжанкова, што рыхтавала ў 1963 г. падрыў глушылкі ў Менску, якая стварала перашкоды для слуханьня заходніх радыёстанцыяў. Падпольшчыкі меркавалі зрабіць гэтую акцыю дэманстрацыйна-прапагандовай і бяскроўнай, рыхтавалі выпуск адмысловай улёткі. Гэтая група, як і шмат іншых, была выкрытая савецкай дзяржбясьпекай з дапамогай сеткі сакрэтных супрацоўнікаў (стукачоў). Тэма ролі апошніх у змаганьні савецкай карнай сыстэмы супраць антысавецкага падпольля, дысыдэнтаў, будзем спадзявацца, яшчэ будзе асьветленая беларускімі дасьледнікамі.

Зразумела, нямала фактаў засталося па-за гэтым выданьнем. Некаторыя справы былі засакрэчаныя, таму пра іх мы абсалютна нічога ня ведаем. Былі яшчэ сотні, тысячы дробных выпадкаў супраціву, якія фіксаваліся рознымі савецкімі органамі і ўстановамі, і згадкі пра іх яшчэ давядзецца адшукаць дасьледнікам. Усё гэта сьведчыць пра немалую колькасьць жыхароў Беларусі, якія не баяліся праяўляць сваю грамадзянскую пазыцыю, рызыкавалі, рабілі свой невялікі ўнёсак у справу барацьбы за свабоду і дэмакратыю.

Сьвятлана Залатуха